ДУ «ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА»

Аддзел краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Інфармацыйнае паведамленне

II КВАРТАЛ

Віцебск 2019

ДУ "ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА"
Аддзел краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

II квартал

2019

Інфармацыйнае паведамленне

ВІЦЕБСК

2019

УДК 008
ББК 71.41(4Беи–4Вит)
К90

Складальнік *Т. В. Пацалуёнак*
Рэдактар *Н. В. Ціпанава*
Адказны за выпуск *Т. М. Адамян*

Культурнае жыццё Віцебскай вобласці : II квартал 2019 года : інфармацыйнае паведамленне / ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», Аддзел краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі ; [склад. Т. В. Пацалуёнак]. – Віцебск, 2019. – 59 с.

Штомесячнае інфармацыйнае паведамленне разлічана на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне.

Прызначана для спецыялістаў інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцаў, выкладчыкаў, студэнтаў і іншых катэгорыяў карыстальнікаў.

© ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», 2019

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

II квартал 2019

Інфармацыйнае паведамленне

Складальнік **Пацалуёнак** Таццяна Віктараўна
Адказны за выпуск Т. М. Адамян
Камп’ютарная вёрстка А. В. Юпатавай

Надрукавана на ксераксе ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна»
210601, г. Віцебск, вул. Леніна, д. 8а
E-mail: kray@vlib.by, vlib@vlib.by

Мерапрыемствы, якія не ўвайшлі ў папярэдні выпуск

Вучаніцы Шаркаўшчынскай дзіцячай школы мастацтваў Кацярына Рамановіч і Мілана Ліпская ўдзельнічалі ў Міжнародным конкурсе фартэпіяннай музыкі «Блукаючая музыка», які праходзіў **30 сакавіка** ў літоўскім горадзе Зарасай з удзелам юных музыкантаў з Літвы, Латвіі і Беларусі. Выхаванкі педагога Святланы Грыгаровіч заваявалі дыпломы II ступені ў сваіх узроставых групах. (*Кліч Радзімы. – 2019. – 20 крас. – С. 3.*)

ПРАДМОВА

«Культурнае жыццё Віцебскай вобласці» – штомесячнае інфармацыйнае паведамленне, разлічанае на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне. Выданне можа быць карысным спецыялістам інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцам, выкладчыкам, студэнтам і іншым катэгорыям карыстальнікаў.

Пастаянная рубрыка «Хроніка падзей» уключае аналітычна перапрацаваную інфармацыю, падрыхтаваную па матэрыялах абласной газеты «Витебские вести», гарадскіх і раённых газет Віцебскай вобласці за перыяд з 1 красавіка па 30 чэрвеня 2019 года, і ўтрымлівае звесткі, прадастаўленыя Віцебскім абласным метадычным цэнтрам народнай творчасці і цэнтральнымі бібліятэкамі вобласці.

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

КУЛЬТУРА

АГУЛЬНЫЯ ПЫТАННІ КУЛЬТУРЫ

2 красавіка – Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі. У Віцебскай абласной філармоніі з нагоды свята адбыўся ўрачысты сход, які завяршыўся канцэртам творчых калектываў Віцебска. «Мастерство на все времена» – пад такой назвай майстры мастацкіх рамёстваў Смаленшчыны прадставілі выставу ў Віцебскім абласным метадычным цэнтры народнай творчасці, прымеркаваную да Дня яднання народаў Беларусі і Расіі. Было падпісана пагадненне аб культурным супрацоўніцтве паміж Віцебскім і Смаленскім абласнымі цэнтрамі народнай творчасці. У Аршанскім ГЦК «Победа» адбыўся святочны канцэрт «Зялёны край – славянская зямля». 2 красавіка ў Дубровенскім раёне сустракалі дэлегацыю Краснінскага раёна Смаленскай вобласці. Творчыя калектывы Віцебшчыны пабывалі на свяце ў г. Веліжы Смаленскай вобласці. Гэта прадстаўнікі Лёзненскага раённага цэнтра культуры, а таксама «Вандроўнікі» і «Славіца» віцебскага прадпрыемства «Элект» ГА «БелТІЗ».

Святкаванне **Першамая** прайшло пад знакам 115-годдзя прафсаюзнага руху Беларусі. У Віцебску адбыўся ўрачысты мітынг на плошчы Перамогі, былі арганізаваны культурна-масавыя мерапрыемствы: канцэрты мастацкай самадзейнасці, творчыя конкурсы, дабрачынныя акцыі, спартыўныя спаборніцтвы і інш. Лейтматыў праведзенага на Віцебшчыне свята – «Труженикам – почет и уважение!».

Віцебшчына разам з усёй краінай урачыста адзначыла 74-ю гадавіну Вялікай Перамогі пад дэвізам «Беларусь памятае». На галоўнай плошчы абласнога цэнтра адбыўся мітынг, прысвечаны Дню Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Напярэдадні свята ў канцэртнай зале «Віцебск» прайшло ўрачыстае мерапрыемства пад назвай

ФОТАМАСТАЦТВА

Напярэдадні 220-годдзя з дня нараджэння А. С. Пушкіна ў Цэнтры сучаснага мастацтва (г. Віцебск) адкрылася фотавыстава «Михайловское. Кабинет Пушкина» са збору Дзяржаўнага мемарыяльнага гісторыка-літаратурнага і прыродна-ландшафтнага музея-запаведніка А. С. Пушкіна «Михайловское».

У рамках міжнароднага фестывалю «ФотоКрок-2019» у выставачнай зале Віцебскага цэнтра сучаснага мастацтва **ў чэрвені** адкрылася экспазіцыя «Идет война народная. Партизанское движение на территории России, Украины и Белоруссии». У яе ўвайшлі 320 рэдкіх фотаздымкаў з Расійскага дзяржаўнага архіва кінафотадакументаў.

КІНАМАСТАЦТВА

13–14 красавіка віцебскі кінатэатр «Мир стаў пляцоўкай для фестывалю польскіх фільмаў «Вісла», які ў другі раз праходзіў у Беларусі.

(мастацкі кіраўнік Тамара Шафранава) і салісты. Другі канцэрт «Ноч у стылі рэтра» пераўтварыўся ў сапраўдную дыскатэку 80-х – 90-х гадоў.

24 мая ансамбль танца, музыкі і песні «Талака» Віцебскай абласной філармоніі адсвяткаваў 25-годдзе вялікім канцэртам на сцэне філармоніі. У фае ўстановы была арганізавана выстава сцэнічных касцюмаў «Талакі» з нумароў «Святочная брама», «Закаблукі», «Бабылі « і іншых, з якімі ансамбль зараз не выступае. Юбілейная праграма «Базар большой» складалася з прэм'ерных і вядомых пастановак знакамітага творчага калектыву і прайшла пры поўным аншлагу.

20 чэрвеня ва ўтульным дворыку Віцебскай абласной філармоніі адбылося ўрачыстае закрыццё XXX канцэртнага сезона. Прагучалі лепшыя творы з рэпертуару сімфанічнага аркестра і салісткі філармоніі Джульеты Тарахчан. Спецыяльным госцем стаў фіналіст нацыянальнага адбору «Еўрабачанне-2019» Мірэкс Сільва.

ХАРЭАГРАФІЯ

У **красавіку** гарадскі Палац культуры «Орша» ў пяты раз прымаў адкрыты абласны конкурс па спартыўных танцах «Stellar Step». 240 пар прадстаўлялі Мінск, Віцебск, Магілёў, Гомель, Полацк, Жодзіна, Асіповічы. Іх майстэрства ацэньвалі суддзі з Беларусі, Украіны, Азербайджана.

Маленькія ўдзельнікі заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь тэатра танца «Прэм'ер-Спонайд» ДУК «Цэнтр культуры «Полацк» заваявалі чатыры прызавыя месцы на Міжнародным танцавальным фестывалі «European and Baltic championship», які праходзіў у **пачатку мая** ў Польшчы.

17 мая ў канцэртнай зале «Віцебск» адсвяткаваў свой 65-гадовы юбілей Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь народны ансамбль танца «Лявоніха». Праграма – даніна памяці легендарнаму кіраўніку Леаніду Барадульку і адлюстраванне творчай гісторыі самабытнага калектыву.

«Поклонимся великим тем годам». На Ушаччыне адзначылі 75-ю гадавіну легендарнага прарыву партызанскага злучэння з фашысцкай блакады і 45-годдзе з дня ўзвядзення мемарыяльнага комплексу «Прарыў», прысвечанага гэтай памятнай падзеі. Адразу два памятныя знакі Героям Савецкага Саюза, ураджэнцам Дубровенскага раёна лётчыку Івану Авекаву і разведчыку Аляксею Габрусеву, устанавілі 9 мая ў парку Воінскай Славы ў райцэнтры. У праграме святкавання Дня Перамогі на Міёршчыне быў кранальны момант адкрыцця дзецьмі сімвалічнай скульптуры «Дзеці міру – дзецям вайны». У Оршы патрыятычная акцыя «Вальс Победы» дала старт творчай агітбрыгадзе «Солдатский привал». Браслаўскі РЦК парадаваў цікавым канцэртам і прэм'ерай спектакля «Вайна вачыма дзяцей» у пастаноўцы рэжысёра Яўгена Набеева. У праграму святкавання Дня Перамогі ў Глыбокім было ўключана адкрыццё пірса на набярэжнай возера Кагальнае і скульптуры «Залатая рыбка», а таксама флэшмоб «75 песень Перамогі» і акцыя «Вальс Перамогі» на гарадской плошчы. Урачыстае мерапрыемства «Свяшчэнная памяць», канцэртная праграма «Іх подзвіг жывы, непаўторны і вечны…», інтэрактыўная пляцоўка «Адкрыты мікрафон. Сцяна памяці», выстава «Апаленая агнём Сенненшчына», акцыя «Спяём «День Победы» разам!» былі арганізаваны ў г. Сянно.

17 мая ў г. Сянно было праведзена пасяджэнне калегіі ўпраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама, на якім разглядалася пытанне «Аб рабоце аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Сенненскага райвыканкама па рэалізацыі прыярытэтных напрамкаў дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры, арганізацыі вольнага часу насельніцтва, развіцці мастацкай творчасці». З інфармацыяй выступіў начальнік аддзела Сяргей Мяцеліца. Начальнік упраўлення культуры Пётр Падгурскі адзначыў, што сфера культуры Сенненшчыны знаходзіцца на высокім узроўні, актыўна развіваецца Дом рамёстваў, плённа працуюць Дзіцячая школа мастацтваў і іншыя ўстановы. Пётр Мікалаевіч падкрэсліў, што прыярытэтным накірункам дзейнасці ўсіх устаноў культуры з'яўляецца захаванне менавіта нацыянальнай культуры, народных

традыцый, побыту беларускага народа. (*Голас Сенненшчыны. – 2019. – 28 мая. – С. 4.*)

21 мая ў зале Бягомльскага Дома культуры пачаўся двухдзённы міжнародны ваенна-гістарычны семінар «Арганізацыя партызанскага руху ў гады Вялікай Айчыннай вайны ў Беларусі: вопыт і сучаснасць». Удзельнічалі навукоўцы, кіраўнікі і супрацоўнікі грамадскіх арганізацый, музеяў Беларусі, Расіі, Літвы, ваенныя дзеячы і інш. У праграме: выступленні ўдзельнікаў сустрэчы, прагляд гістарычнага фільма «Бягомльская легенда», выстава Дзяржаўнага музея ваеннай гісторыі Рэспублікі Беларусь «Помнім – ганарымся!», наведванне Бягомльскага музея народнай славы, урачысты мітынг, ушанаванне памяці загінуўшых, тэатралізаваная пастаноўка «Званы Шунёўкі» на мемарыяльным комплексе «Праклён фашызму», адкрыццё сквера ў гонар 75-годдзя вызвалення Беларусі, вялікі канцэрт творчых калектываў раёна. На наступны дзень госці наведалі працоўныя калектывы Докшыччыны, выступілі ва ўстановах адукацыі. (*Родныя вытокі. – 2019. – 25 мая. – С. 1, 4–5.*)

Усенародным святам стаў Дзень памяці святой Еўфрасінні Полацкай, які **5 чэрвеня** сабраў у старажытным горадзе паломнікаў з Беларусі, Расіі, Украіны, Латвіі, Польшчы. Было праведзена мноства мерапрыемстваў не толькі царкоўнага. але і свецкага характару: пленэр юных мастакоў, творчыя выставы, канцэрты, духоўна-асветныя праекты ва ўстановах адукацыі і культуры. У Сафійскім саборы прайшоў канцэрт духоўнай музыкі, вялікая святочная праграма была арганізавана ля помніка выдатнай асветніцы і нябеснай апякунцы беларускага народа.

8 чэрвеня свой 61-ы дзень нараджэння адзначыў г. Наваполацк. У праграме: шэсце працоўных калектываў, святочны канцэрт «Мой горад! Мая біяграфія!», кірмаш «Горад майстроў». Дзейнічалі пляцоўка сярэднявечнай культуры, выстава работ па выніках XI Міжнароднага пленэру юных мастакоў «Палітра Прыдзвіння», прысвечанага І. Ф. Хруцкаму. З канцэртнымі праграмамі выступілі беларускі музыкант і

прадстаўлены імі спектакль «Холстомер» па творы Л. Талстога яны атрымалі падзячную грамату. Кіраўнік тэатра і рэжысёр Ігар Баярынцаў правёў на злёце майстар-клас «Выяўленне канфлікту ў драме».

МУЗЫЧНАЕ ЖЫЦЦЁ

3–24 красавіка ў канцэртнай зале Полацкага Сафійскага сабора прайшоў XXXII Міжнародны фестываль старадаўняй і сучаснай камернай музыкі з удзелам лепшых камерных выканаўцаў з Беларусі, Ізраіля, Літвы, Германіі, Расіі і Італіі. У дні форуму, 10–12 красавіка, ужо ў трэці раз адбыўся адкрыты абласны дзіцячы фартэпіянны конкурс «И. С. Бах и XXI век».

28 красавіка ў шосты раз прайшоў фестываль «Гучаць старадаўнія арганы Пастаўшчыны». Адкрыццё музычнага свята адбылося ў Камайскім касцёле Святога Іаана Хрысціцеля. Сёлетні канцэрт прысвяцілі паэту, настаўніку Аркадзю Нафрановічу. У канцэрце выступілі арганіст Мінскага касцёла Святой Тройцы Віктар Кісцень і салістка Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь Наталля Акініна. Гучала арганная музыка таксама ў Лынтупскім і Лучайскім храмах. Закрыццё фестывалю адбылося ў Пастаўскім касцёле Святога Антонія Падуанскага, у рамках якога была прэзентавана кніга «Арганная культура Пастаўшчыны» мясцовага краязнаўцы Ігара Пракаповіча.

4 мая адзначалася 105-годдзе з дня нараджэння знакамітага кампазітара Марка Фрадкіна, ураджэнца г. Віцебска. Юбілейнай даце была прысвечана канцэртная праграма «Вернулся я на родину…» у Цэнтры культуры «Віцебск». Аднайменная выстава фотадакументаў з асабістага архіву Марка Рыгоравіча, якую прадставіў унук кампазітара Антон Фрадкін, экспанавалася ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі.

22 мая Віцебская абласная філармонія адзначыла свой 30-гадовы юбілей двума канцэртамі. Урачыстасці пачаліся з віншаванняў і ўручэння грамат і падзяк. У гала-канцэрце выступілі сімфанічны аркестр пад кіраўніцтвам Уладзіміра Бяляўскага, актэт балалаек «Віцебскія віртуозы»

вяртанне ў Віцебск» і спектакль «Загубленая душа, або Пакаранне грэшніка» паводле твораў Яна Баршчэўскага, які трывала ўвайшоў у залаты фонд тэатра «Лялька».

30 красавіка ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Я. Коласа адбылася прэм'ера спектакля «Скрыпкі часам вядуць да вар'яцтва» паводле Ф. Саган. Рэжысёр – Дар'я Марчанка. Мастак – Андрэй Жыгур.

13–14 мая на камернай сцэне тэатра імя Я. Коласа прайшоў заключны этап гарадскога конкурсу «Сцэнічныя чытанні «Школьны тэатр-23». 10 калектываў імкнуліся даказаць творчае першынство. Журы на чале з народнай артысткай Беларусі Святланай Акружной прысудзіла Гран-пры студыі «Перазагрузка» Віцебскага гарадского цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі (кіраўнік Наталля Шлімакова).

23–24 мая на сцэне коласаўскага тэатра адбыліся гастролі Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага. Гастрольная афіша: Д. У. Крыстнэр «Спякотныя мамачкі», С. Моэм «Кола кахання».

24 мая ў вялікай зале тэатра імя Я. Коласа адбылася сустрэча працоўнага калектыву з першым намеснікам Міністра культуры Рэспублікі Беларусь Н. У. Карчэўскай.

1 чэрвеня ў Беларускім тэатры «Лялька» юныя гледачы сустрэлі першы дзень лета і школьных канікулаў у вясёлай кампаніі Велікана (Яўген Гусеў), Клоўна (Аляксей Макарскі) і Феі-чараўніцы (Наталля Гайдук). Летні рэпертуар распачаўся інтэрактыўным спектаклем «Вясёлы Дарафей».

27 чэрвеня на коласаўскай сцэне адбылася прэм'ера спектакля «Экстрасэнсы» па п'есе Рыгора Горына «Феномены». Рэжысёр-пастаноўшчык Ірына Цішкевіч. Мастак-пастаноўшчык Юлія Карымава. У ролях: Яўген Бераснеў, Вячаслаў Грушоў, Цімур Жусупаў, Арцём Блахін, Юлія Крашэўская і інш.

Навучэнцы Віцебскага дзяржаўнага каледжа культуры і мастацтваў выступілі на злёце аматарскіх тэатраў «Играем вместе», арганізаваным у **чэрвені** Даўгаўпілскай краявой думай Латвіі. За

кампазітар Зміцер Вайцюшкевіч, ВІА «Зеркало» з г. Архангельска, папулярная група «Лепрыконсы».

17–21 чэрвеня на Ушаччыне прайшоў Тыдзень святочных мерапрыемстваў з нагоды 95-годдзя з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава. У Кубліцкім СДК адкрылася выстава і прайшоў раённы конкурс вакальных калектываў «Спявай, душа!». У Кубліцкай сельскай бібліятэцы імя В. Быкава была праведзена літаратурная гасцёўня «Творчы шлях В. Быкава. Асобы падыход да тэмы вайны ў творчасці». У Бычках, дзе знаходзіцца сядзіба-музей Васіля Быкава, былі арганізаваны экскурсіі, працавалі выставы Дома рамёстваў і Ушацкай ЦБС, была падрыхтавана тэатралізаваная кампазіцыя «На сцяжынцы жыцця». У праграме таксама – адкрыты кінапаказ «Па матывах аповесцяў і апавяданняў В. Быкава», канцэртная праграма творчых калектываў раёна ў скверы райцэнтра.

Мерапрыемствы з нагоды 75-годдзя вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 95-годдзя ўтварэння раёна прайшлі **23 чэрвеня** ў Шуміліне з удзелам кіраўніцтва вобласці і раёна, жыхароў і шматлікіх гасцей. На свята прыехала дэлегацыя Велікалуцкага раёна Расіі. Мерапрыемствы на цэнтральнай плошчы і ў гарадскім парку ладзіліся да позняй ночы і фінішавалі яркім феерверкам. Уражваючымі былі паказальныя выступленні 103-й асобнай гвардзейскай паветрана-дэсантнай брыгады. Трапяткім і кранальным быў тэатралізаваны рэквіем «Высечаныя ў камяні», які прйшоў на брацкіх могілках. Творчыя калектывы вобласці і Велікалуцкага раёна падарылі шумілінцам выдатны канцэрт. Па вуліцах райцэнтра з канцэртам праехаў аўтаклуб.

У Полацкім райвыканкаме адбылося пасяджэнне, прысвечанае пытанням развіцця сферы культуры. Удзельнічалі дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Н. В. Гуйвік, намеснік начальніка аддзела работы арганізацый сферы культуры Віцебскага аблвыканкама С. Д. Генеральніцкі, прадстаўнікі клубных устаноў, бібліятэк, музеяў, кінатэатра «Радзіма» і парка культуры і

адпачынку, устаноў дадатковай адукацыі ў галіне культуры. Галоўная ўвага была звернута на правядзенне ў Полацкім раёне міжнародных і рэспубліканскіх культурна-масавых мерапрыемстваў. (*Полацкі веснік. – 2019. – 28 чэрв. – С. 2.*)

26 чэрвеня на Дубровеншчыне прайшлі мерапрыемствы, прысвечаныя 75-й гадавіне з дня вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На брацкай магіле Петрыкі, дзе пахаваны каля 8 тысяч салдат і афіцэраў, загінуўшых пры вызваленні раёна, адбылося перапахаванне астанкаў яшчэ аднаго воіна-вызваліцеля. Быў урачыста адкрыты памятны знак з QR-кодам на брацкім пахаванні ў аграгарадку Буда. У парку Воінскай славы прайшоў урачысты мітынг і была закладзена капсула міру. У гэты дзень адбылося свята горада «75 мірных гадоў». У канцэртнай праграме прынялі ўдзел артысты з п. Красны Смаленскай вобласці, Шуміліна, Лёзна, Оршы.

Бешанковіцкі раён адзначыў знамянальную дату – 75-годдзе вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. **26 чэрвеня** на мемарыяльным комплексе «Узрэчча» адбыўся мітынг-рэквіем, на якім прысутнічала дэлегацыя Кыргызстана. Удзельнікі ваенна-гістарычных клубаў з Беларусі, Расіі і Прыбалтыкі правялі ваенна-гістарычную рэканструкцыю «Плацдарм».

26–30 чэрвеня ў абласным цэнтры адбыліся святочныя мерапрыемствы, прысвечаныя 1045-годдзю Віцебска і 75-й гадавіне вызвалення горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Па традыцыі ў гадавіну вызвалення адбылося ўскладанне кветак і вянкоў да Вечнага агню мемарыяльнага комплексу ў гонар савецкіх воінаў, партызан і падпольшчыкаў на плошчы Перамогі. На вуліцы 1-й Даватара адбылося адкрыццё пасля рэканструкцыі мемарыяльнай дошкі ўдзельніку вызвалення горада Дзмітрыю Мясаедаву, які 26 чэрвеня 1944 года ўстанавіў Чырвоны сцяг на Доме спецыялістаў. На вуліцы Багдана Хмяльніцкага быў урачыста адкрыты памятны знак, прысвечаны 75-годдзю Партызанскага парада ў Віцебску 23 ліпеня 1944 года. На будынку Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага каледжа ўрачыста адкрылі

наведвальнікаў майстры Гарадоцкага Дома рамёстваў і фальклору і члены народнага клуба майстроў і самадзейных мастакоў «Вытокі».

«Патаемнае» – пад такой назвай **у чэрвені** працавала выстава ручнікоў у Глыбоцкім Доме рамёстваў.

У рамках умацавання сяброўскіх сувязяў Лёзненшчыны з суседнімі расійскім рэгіёнамі Лёзненскі Дом рамёстваў правёў выставы-кірмашы ў Рудні і Ельні Смаленскай вобласці. Аўтары экспанатаў абмяняліся творчым вопытам з расійскім калегамі.

ТЭАТРАЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ

5–7 красавіка ў Полацку прайшоў першы ў краіне Міжнародны фестываль монаспектакляў «Umoўno» з удзелам тэатральных калектываў з Беларусі, Расіі, Літвы, Латвіі, Эстоніі. Арганізатары – Полацкі райвыканкам, гарадскі Палац культуры і народны тэатр гістарычнага касцюма «Полацкі зьвяз».

19 красавіка ў Полацкім гарадскім Палацы культуры адбыліся юбілейныя ўрачыстасці з нагоды 70-годдзя Полацкага тэатра – аднаго са старэйшых аматарскіх тэатраў Беларусі. Датай заснавання тэатра лічыцца 1948 год, а з 1954 года ў калектыва з’явілася свая сцэна – сцэна гарадскога Палаца культуры. Яго праваперaемнікам з’яўляецца Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь народны тэатр «Пілігрым». У праграме: музейная экспазіцыя «Славное сегодня невозможно без достойного вчера»; паказ спектакля «Не пакідай мяне» па п’есе Аляксея Дударава ў пастаноўцы Веры Кісялёвай; сустрэча з вядомым беларускім драматургам і сцэнарыстам, старшынёй Беларускага саюза тэатральных дзеячаў Аляксеем Дударавым.

20–21 красавіка Беларускі тэатр «Лялька» святкаваў свой 33-і дзень нараджэння. Дзеці змаглі пабачыць імправізацыю Міхася Клімчука «Казкі пра казку» паводле твораў Ганны Селівончык і музычны спектакль-рэпетыцыю Віктара Клімчука «Тук-тук! Хто там?» па п’есе Любаміра Ралчава. Дарослыя паглядзелі новую пастаноўку В. Клімчука «Мастак.

іконы, выкананыя ў розных тэхніках, габелены, рознакаляровыя яйкі, анёлы, пацешныя зайцы і інш.

Да **14 мая** ў выставачнай зале Віцебскага АМЦНТ працавала выстава выяўленчага мастацтва «Свет вачыма дзяцей» узорных студый: «Жывапіс» Цэнтра культуры г. Наваполацка, мастацкай студыі «Каларыт» Расонскай ДШМ, выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Лепельскага РДК.

17 мая ў выставачнай зале Віцебскага АМЦНТ адкрылася абласная выстава традыцыйных галаўных убораў Віцебшчыны, якая праводзіцца ў мэтах вывучэння і аднаўлення традыцыйных галаўных убораў жыхароў Падняпроўя, Падзвіння і Паазер'я. Тут прадстаўлены: дзявочыя вянкі, павязкі (скіндачкі), вясельныя вянкі з фатой, каруны; жаночыя хусткі, чапцы, павойнікі, шалі, абхінанкі; мужчынскія магеркі, аблавухі, брылі, картузы.

У Бешанковіцкім раённым Доме рамёстваў была арганізавана этнаграфічная выстава «Бабулін куфэрак». На працягу **мая – чэрвеня** наведвальнікі знаёміліся з унікальнымі работамі (посцілкі, сурвэткі, фіранкі, падзоры і інш.) мясцовых рукадзельніц.

19 чэрвеня ў выставачнай зале Віцебскага АМЦНТ пачала працаваць абласная выстава народнага аматарскага жывапісу «Мая сям'я», прысвечаная 75-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. У экспазіцыі прадстаўлена звыш 100 жывапісных палотнаў і 30 драўляных скульптур і кампазіцый 40 мастакоў-аматараў Віцебшчыны.

На XI рэспубліканскім фестывалі-кірмашы народных мастацкіх рамёстваў «Вясновы букет», які штогод ладзіцца ля Мінскай ратушы, работа майстроў Докшыцкага дома рамёстваў была адзначана другім месцам.

21 чэрвеня ў выставачнай зале КАЦ «Гарадок» адкрылася выстава вышыўкі пад назвай «Нити души». Свае работы прапанавалі ўвазе

мемарыяльную дошку ў гонар народнага ўрача Беларусі, Ганаровага грамадзяніна гарадоў Віцебска і Мінска Ігнація Антонава. На гарадскіх могілках у Мазурыне быў урачыста адкрыты помнік-бюст былому генеральнаму дырэктару Цэнтра культуры «Віцебск», Ганароваму грамадзяніну горада Віцебска Радзівону Басу. Адбылася ўрачыстая цырымонія прысваення імя двойчы Героя Савецкага Саюза І. Х. Баграмяна сярэдняй школе № 46. На фасадзе будынка школы адкрылі маштабнае графіці з выявай партрэта маршала (аўтар – малады віцебскі мастак Юрый Дуброўскі). Рэтраспектыву першай пасляваеннай выставы, якая была адкрыта ў ратушы ў пачатку ліпеня 1944 года, прадставіў Віцебскі абласны краязнаўчы музей. У раёне маста імя Блахіна рэканструктары з ваенна-гістарычных клубаў Беларусі і Расіі правялі гістарычную рэканструкцыю «Бой за Віцебск». У Летнім амфітэатры адбылося ўрачыстае пасяджэнне і канцэрт «Мой город – моя любовь». Святочны Віцебск прымаў дэлегацыі з гарадоў-пабраціміаў і партнёраў з Расіі, Арменіі, Сербіі, Латвіі, Балгарыі. На свята прыбылі прадстаўнікі абласных цэнтраў Гомеля і Магілёва, грамадскіх арганізацый – ветэраны з падмаскоўнага Ступіна, дэлегаты Смаленскага гарадскога і Смаленскага абласнога саветаў жанчын Расіі.

27–30 чэрвеня Орша святкавала свой 952-і дзень нараджэння і 75-годдзе вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Урачыстасці пачаліся з малебна на Гарадзішчы і ўзняцця сцяга горада ля будынка райвыканкама, узнагароджання ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і ветэранаў працы, актывістаў ветэранскага руху. Пасля цырымоніі ўскладання кветак і вянкоў да памятнага знака воінам-вызваліцелям была праведзена патрыятычная акцыя «Памяць сэрца» ў гарадской мастацкай галерэі В. А. Грамыкі. Сімвалічна. што аршанцы ў дзень нараджэння горада прымалі ўдзельнікаў Міжнароднага комплекснага аўтапрабегу ДТСААФ Расіі і Беларусі. Адбылося ўрачыстае адкрыццё мемарыяльнай дошкі заслужанаму ўрачу БССР Міхаілу Пятровічу Усевічу на будынку бальніцы № 1 імя Сямашкі. У рамках святкавання працавалі тэматычныя пляцоўкі, кірмаш народных умельцаў «Орша мастеровая», праходзілі канцэрты і інш.

30 чэрвеня адбылося паэтычнае свята «Гучыць Купалаўская ліра» ў в. Ляўкі Аршанскага раёна.

28 чэрвеня прайшоў Дзень памяці «Партызанская слава Шчалбоўскіх лясоў», прымеркаваны да 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і адкрыцця пасля рэстаўрацыі помніка партызанам «Хозяин леса» ва ўрочышчы Шчалбова Гарадоцкага раёна. Помнік быў урачыста адкрыты 5 чэрвеня 1970 года. Аўтар – вядомы беларускі мастак, мастацтвазнаўца, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, ураджэнец Гарадоччыны Анатоль Фёдаравіч Кавалёў. На ўрачыстым мітынгу выступілі старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў У. Цярэнцьеў, старшыня Гарадоцкага райвыканкама П. Карабач, відавочцы падзей Вялікай Айчыннай вайны.

29 чэрвеня самы маленькі горад Беларусі Дзісна адзначыў сваё 1000-годдзе і 450-годдзе прысваення яму Магдэбургскага права. Свята ў дзісенскім парку прайшло ярка і масава. Парадавалі сваімі выступленнямі артысы Дзісенскага ГЦК і госці з Полацка – ВІА «Начная птушка» і ансамбль «Мужыкі». Працавала выстава вырабаў майстроў Дзісенскага Дома рамёстваў і карцін мясцовага мастака Уладзіміра Расанца. Уразілі прысутных выступленні ваеннаслужачых войск спецыяльнага прызначэння і байкерскага клуба.

КУЛЬТУРНЫЯ СУВЯЗІ

У рамках дагавору аб супрацоўніцтве і добрасуседстве Расонскі раён **у маі** наведала дэлегацыя з Карсаўскага краю Латвійскай Рэспублікі. Акрамя гандлёва-эканамічных пытанняў абмяркоўвалася таксама ўзаемадзеянне ў галіне культуры на бліжэйшы час. Госці наведалі раённы Цэнтр культуры і народнай творчасці і запрасілі юных удзельнікаў мастацкай самадзейнасці РЦК на святкаванне Дня Карсаўскага краю.

«Дзень латвійскага мастацтва ў Полацку: пластыка формы, пластыка вобразу» – мерапрыемства ў Музеі беларускага кнігадрукавання стала яшчэ адным крокам на шляху збліжэння Беларусі і Латвіі. Былі

19 карцін са збору Ушацкага музея народнай славы імя У. Е. Лабанка і 12 твораў з фондаў Віцебскага абласнога краязнаўчага музея.

У **маі – чэрвені** ў Аршанскай гарадской мастацкай галерэі В. А. Грамыкі экспанаваліся выставы: «Малая радзіма вачыма беларускіх мастакоў-пейзажыстаў» з калекцыі Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь і «Расцветали яблони…», прадстаўленая Студыяй ваенных мастакоў і творчым аб’яднаннем «Традыцыя» (г. Мінск).

Мастачка з Латвіі Байба Прыедзітэ **ў чэрвені** прадставіла сваю персанальную выставу акварэльных работ «Імгненні» ў Мастацкім музеі Віцебска.

Рэтраспектыўная выстава работ вядомага беларускага скульптара Уладзіміра Слабодчыкава адкрылася **ў чэрвені** ў Мастацкім музеі Віцебска.

Наваполацк сабраў звыш 50 прадстаўнікоў з 14 гарадоў Беларусі, Расіі, Латвіі, Казахстана на XI Міжнародны пленэр-конкурс «Палітра Прыдзвіння», прысвечаны Івану Хруцкаму. Арганізатар – Дзіцячая мастацкая школа імя І. Ф. Хруцкага. Юныя мастакі малявалі пейзажы Наваполацка і яго наваколля, стварылі нацюрморты. 5 чэрвеня пленэр прадоўжыўся ў Дзісне Міёрскага раёна. Гран-пры дастаўся прадстаўніцы расійскага горада Электрасталь.

ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОЕ МАСТАЦТВА

5 красавіка ў выставачнай зале КАЦ «Гарадок» адкрылася выстава пад назвай «Жаночыя сакрэты». У экспазіцыі прадстаўлены жаночыя ўпрыгажэнні і аксесуары, выкананыя майстрамі Дома рамёстваў і фальклору і гарадоцкімі рукадзельніцамі-аматарамі.

У **красавіку** ў выставачнай зале Чашніцкага Дома рамёстваў адкрылася выстава работ майстра па кераміцы Святланы Арэхавай пад назвай «Палітра маёй душы».

Выстава майстроў Верхнядзвінскага Дома рамёстваў, прысвечаная святу Уваскрасення Хрыстова, экспанавалася **ў красавіку – маі** ў раённым Цэнтры культуры і народнай творчасці. У экспазіцыі былі прадстаўлены

«С любовью к музыке и детям» – пад такой назвай **31 мая** адбыўся ўрачысты вечар, прысвечаны 50-годдзю Дзіцячай школы мастацтваў № 2 г. Оршы.

15–16 чэрвеня ў Віцебску былі праведзены XXVII Міжнародныя Шагалаўскія чытанні, прысвечаныя 100-годдзю заснавання Віцебскага народнага мастацкага вучылішча. У гэтым годзе ў навуковай канферэнцыі прынялі ўдзел 14 даследчыкаў з Беларусі, Расіі, Ізраіля, ЗША.

ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА

У **красавіку** адкрылася выстава работ віцебскага мастака Уладзіміра Літвіна ў Віцебскім цэнтры сучаснага мастацтва.

У Віцебскім абласным краязнаўчым музеі **ў красавіку** экспанавалася выстава работ удзельнікаў 16-га трыенале медальернага мастацтва Латвіі. У экспазіцыі былі прадстаўлены 76 работ 24 аўтараў.

У Мастацкім музеі Віцебска **ў красавіку** адкрылася выстава «Aquatoria». У экспазіцыі – 53 акварэльныя работы дацэнта кафедры дызайну ВДТУ Святланы Урублеўскай.

У Арт-цэнтры Марка Шагала напрыканцы **красавіка** адкрылася выстава графікі мастака з Ізраіля Іосіфа Капеляна. 60 гадоў назад у Віцебску экспанавалася яго першая персанальная выстава, калі ён вучыўся на мастацка-графічным факультэце Віцебскага педінстытута.

У мастацкай галерэі «Каляровы шлях» г. Оршы **ў красавіку** адкрылася выстава «Фарбы роднай зямлі» мастака з Барані Мікалая Таранды. **17 мая** гэты вядомы жывапісец і графік, ганаровы грамадзянін Барані прадставіў сваю выставу «Сімфонія жыцця» ў культурна-выставачным комплексе імя Ценішавых (г. Смаленск).

Выставачную залу Полацкага гарадскога Палаца культуры **ў маі** ўпрыгожыла новая выстава «Песня колеру» народнага клуба мастакоў-аматараў «Белый холст», прысвечаная Году малой радзімы.

У Мастацкім музеі Віцебска **ў маі** пачала экспанавацца выстава «Партызанская галерэя». Увазе наведвальнікаў былі прадстаўлены

прадстаўлены выстава медальернага мастацтва і мастацтва кіно сучаснай Латвіі. Праект рэалізаваны пры непасрэдным удзеле Консульства Латвійскай Рэспублікі ў Віцебску і асабіста консула Угіса Скуі. (*Полацкі веснік. – 2019. – 4 чэрв. – С. 2.*)

Народны ансамль народнай песні «Заманіха» Полацкага раённага Цэнтра культуры прыняў удзел у XVIII Міжнародным фестывалі народнага мастацтва і рамёстваў «Садко», які праходзіў у Вялікім Ноўгарадзе **31 мая – 2 чэрвеня**. Ансамбль годна прадставіў Беларусь, выступаючы на адной сцэне з калектывамі з розных рэгіёнаў Расіі, Індыі і Балгарыі.

Латвійскі горад Лудза стаў цэнтрам сяброўства культурных фармацый з Латвіі, Літвы і Беларусі. **22 чэрвеня** там прайшоў культурна-гістарычны фестываль «Sabri». Народны гурт архаічных спеваў «Княжыч» Цэнтра рамёстваў і традыцыйнай культуры Наваполацка прадставіў на фэсце беларускія спевы купальскага цыкла.

29 чэрвеня, у рамках свята «Песні сунічных бароў», у г. п. Лёзна адбылося падпісанне дагавору аб сяброўстве, добрасуседстве і супрацоўніцтве паміж Лёзненскім раёнам і Андрушоўскай раённай Радай Жытомірскай вобласці Украіны. Таксама быў падпісаны мемарандум аб сяброўстве і супрацоўніцтве паміж Лёзненскім раёнам і «Цэнтрам беларускай культуры» Даўгаўпілскай гарадской Думы Латвійскай Рэспублікі. Адбылася дамоўленасць аб супрацоўніцтве ў галінах культуры, адукацыі, аховы здароўя, спорту і турызму.

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНАЯ РАБОТА. САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У СФЕРЫ ВОЛЬНАГА ЧАСУ

2 красавіка да Дня яднання народаў Беларусі і Расіі ў Акцябрскай бібліятэцы Віцебскага раёна прайшоў тэматычны вечар «Саюз Беларусі і Расіі», арганізаваны сумесна з Домам культуры і Віцебскім раённым краязнаўчым музеем. Супрацоўнікі музея прадставілі слайдавую

прэзентацыю «Адзінства без межаў» – пра сяброўства дзвюх краін, імкненне да захавання далейшага адзінства. Бібліятэкар прапанавала гасцям вечара віктарыну і агляд кніжнай выставы «Дзве краіны – адзін лёс».

25 красавіка ў Віцебскім абласным метадычным цэнтры народнай творчасці адбыўся абласны семінар для кіраўнікоў вакальных і вакальна-харавых калектываў «Голас – самы дасканалы музычны інструмент». На семінары разглядаліся пытанні падрыхтоўкі і правядзення абласнога конкурсу харавых калектываў «Браслаўская харавая асамблея» ў межах Міжнароднага свята традыцыйнай культуры «Браслаўскія зарніцы».

26 красавіка, у Міжнародны дзень памяці ахвяр радыяцыйных аварый і катастроф, работнікі Талачынскай раённай бібліятэкі і Талачынскага раённага цэнтра культуры правялі сумесную тэматычную сустрэчу «Чарнобыль – чорная быль нашай гісторыі».

На працягу **мая** бібліятэкары Талачынскай ЦРБ сумесна з аўтаклубам наведвалі сельскія населеныя пункты раёна і праводзілі вечары-сустрэчы, на якіх разам з атрыманымі кнігамі пра подзвіг савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне жыхары слухалі вершы і песні ваенных гадоў.

15 чэрвеня ў Віцебскім АМЦНТ прайшоў абласны семінар-практыкум «Свята як культурны брэнд тэрыторыі» для клубных работнікаў вобласці з наведваннем і ўдзелам у раённым фестывалі «Волаты Прыдзвіння» ў Віцебскім раёне. Падчас семінара вопытам арганізацыі і правядзення рэгіянальных святаў і фестываляў падзяліліся супрацоўнікі ўстаноў культуры Гарадоцкага і Полацкага раёнаў Таццяна Аўсянка і Ірына Крыванос.

19 чэрвеня ў рамках выязнога пасяджэння прэзідыума Докшыцкага раённага Савета дэпутатаў была праведзена тэматычная гадзіна «Хлеб, соль і доля», якую падрыхтавалі ўдзельнікі гуртка, што працуе пры Тумілавіцкай сельскай бібліятэцы-клубе.

11-гадовая выхаванка Шумілінскай дзіцячай школы мастацтваў Марыя Скорынава стала лаўрэатам Брусельскага міжнароднага конкурсу юных піяністаў «Merci, maestro!», які праводзіўся **26–28 красавіка**. Яна выйшла ў фінал і атрымала ганаровую ўзнагароду як самая юная ўдзельніца сярэдняй узроставай групы.

27–28 красавіка ў г. Пскове адбыўся III Міжнародны агляд-конкурс мастацтваў «Цветы нации». Беларусь прадстаўлялі юныя таленты Расонскай дзіцячай школы мастацтваў. Яны былі адзначаны дыпломамі I, II і III ступеняў, а цымбалістка Надзея Лабанава атрымала Гран-пры ў намінацыі «Народныя інструменты. Саліст».

Народны вакальны ансамбль «Вярба» Докшыцкай ДШМ прадстаўляў Беларусь на Міжнародным фестывалі мастацкай творчасці «З Расіяй у сэрцы», які праходзіў у Смаленску ў рамках святкавання Дня Перамогі.

Геаграфія Міжнароднага конкурсу дзіцячай творчасці «Ветразі сяброўства», ініцыятарам правядзення якога ў другі раз выступіла Расонская ДШМ, пашырылася. **У маі** на сцэну школы мастацтваў выйшлі 39 юных салістаў-вакалістаў і музыкантаў з г. п. Расоны, гарадоў Пскова і Себежа Расійскай Федэрацыі.

25 мая ў Цэнтры культуры Наваполацка ў другі раз прайшоў фестываль сучаснага ўрбаністычнага мастацтва «Живой бетон» з удзелам пачынаючых музыкантаў, паэтаў, танцораў, мастакоў, архітэктараў, фатографаў, рамеснікаў. Звыш 40 прадстаўнікоў Наваполацка, Полацка, Віцебска, Мінска, Магілёва, Светлагорска ўнеслі сваю культурную самабытнасць у гэты крэатыўны праект.

Барабаншчыкі з Оршы і Барані ўвайшлі ў Кнігу рэкордаў Гінэса. **26 мая** ансамблі Drum Show ДШМ № 2 і Drum Shock ДШМ № 3 пад кіраўніцтвам Мікалая і Антона Жалезняковых прынялі ўдзел у масавым выкананні крэшчэнда на свяце Дня заснавання горада на Неўскім праспекце ў Санкт-Пецярбургу.

знакамітага земляка Яна Баршчэўскага. Удзельнікі канферэнцыі выступілі з дакладамі і наведалі в. Мурагі, дзе нарадзіўся і вырас вядомы пісьменнік.

25 чэрвеня Бешанковіцкі раённы гісторыка-краязнаўчы музей адсвяткаваў 40-гадовы юбілей.

У **чэрвені** ў музеі гісторыі Віцебскага народнага мастацкага вучылішча адкрылася выстава вядомага фатографа, аднаго з заснавальнікаў канструктывізму, роданачальніка дызайну і рэкламы ў СССР Аляксандра Родчанкі.

У Лепельскім раённым краязнаўчым музеі **ў чэрвені** была арганізавана выстава жывапісу «Эхо войны и память сердца», прымеркаваная да 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Аўтары – прафесійныя і самадзейныя мастакі, якія ваявалі або былі дзецьмі вайны.

У музеі гісторыі і культуры г. Наваполацка **ў чэрвені** экспанаваліся: выстава «Сяброўства без межаў» (сувеніры, падараваныя дэлегацыямі гарадоў-пабрацімаў), маштабнае пано-абярэг, створанае ў рамках міжнароднага творчага праекта «Полацкі квілт».

МАСТАЦТВА

9–10 красавіка ў Віцебску была праведзена Міжнародная канферэнцыя «Віцебская народная мастацкая школа і яе спадчына (1918–1922)», прысвечаная 100-годдзю Віцебскага народнага мастацкага вучылішча. Чытанні з удзелам даследчыкаў з Беларусі, Расіі, Вялікабрытаніі, Нідэрландаў, ЗША, Германіі, Францыі праходзілі ў Арт-цэнтры Марка Шагала і Музеі гісторыі Віцебскага народнага мастацкага вучылішча.

Вучаніца Наваполацкай ДШМ № 1 Дар’я Ізмайловіч атрымала дыплом лаўрэата I ступені на V Міжнародным конкурсе інструментальнай і вакальнай творчасці «Славься, Глинка!», які праходзіў **11–14 красавіка** ў г. Смаленску.

КЛУБНАЯ СПРАВА

4 красавіка ў аграгарадку Буда Дубровенскага раёна было праведзена свята патрыятычнай песні «Радзіма мая дарагая», прысвечанае Году малой радзімы. У рамках свята прайшоў раённы агляд студый эстраднай песні «Песні аб Радзіме». Арганізатар – ДУК «Раённы цэнтр народнай творчасці і культурна-дасугавай дзейнасці Дубровенскага раёна».

Свой 30-гадовы юбілей адзначыў народны тэатр мініяцюр «Балаган» Лепельскага раённага Дома культуры. У насычанай праграме ўдзельнікі калектыву паказалі гледачам лепшыя інсцэніроўкі свайго тэатра. (*Лепельскі край. – 2019. – 16 крас. – С. 4.*)

Народная студыя эстраднай песні «Ліра» Дубровенскага РДК адзначыла 20-гадовы юбілей музычным шоу «Красиво…» на сцэне Дома культуры. (*Дняпроўская праўда. – 2019. – 17 крас. – С. 5.*)

4 красавіка народны драматычны тэатр «Время» Цэнтра культуры г. Наваполацка прадставіў гледачам прэм’еру спектакля «Жанчына і кларнет» па творы Майкла Крыстафера. Рэжысёр Алена Клопава.

У Мазалаўскім СДК Віцебскага раёна было праведзена свята нацыянальных культур у межах сацыякультурнага праекта «Дыялог народаў і культур». У мерапрыемстве разам з замежнымі студэнтамі ВДУ імя П. М Машэрава і ветэрынарнай акадэміі, якія з’яўляюцца ўдзельнікамі клуба інтэрнацыянальнага сяброўства «Згода», прынялі ўдзел госці – студэнты і выкладчыкі Лільскага ўніверсітэта Францыі. (*Витьбичи. – 2019. – 25 апр. – С. IV–V.*)

23 красавіка на сцэнічнай пляцоўцы аршанскага ГЦК «Победа» народны гарадскі тэатр прадставіў спектакль «Осторожно, женщины!» па п’есе беларускага драматурга Андрэя Курэйчыка. Рэжысёр-пастаноўшчык Васіль Мігаль.

25 красавіка ў Цэнтры культуры г. Наваполацка адбыўся вялікі канцэрт народнага хору ветэранаў, прысвечаны 75-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 35-гадоваму юбілею творчага калектыву.

Салісты эстраднай вакальнай студыі «Славія» Цэнтра культуры і народнай творчасці Пастаўскага раёна ўдзельнічалі ў IX Міжнародным вакальным конкурсе, які праходзіў **25 красавіка** ў г. Рокішкіс (Літва), і сталі лаўрэатамі конкурсу ў сваіх намінацыях.

26 красавіка на сцэне Расонскага раённага Цэнтра культуры і народнай творчасці была праведзена дабрачынная канцэртная праграма з удзелам самадзейных артыстаў «Музыка нас связала» ў дапамогу аддзяленню дзённага знаходжання для інвалідаў ТЦСАН.

«Товарищ Память» – пад такой назвай прайшоў канцэрт у гонар Дня Перамогі ў Боркавіцкім СДК Верхнядзвінскага раёна. Адметным стаў актыўны ўдзел у мерапрыемстве аматараў мастацкай самадзейнасці з Луначарскага псіханеўралагічнага дыспансера для састарэлых і інвалідаў. Уразіла і выстава партрэтаў салдацкіх маці і савецкіх воінаў, выкананых Іллёй Астаповічам.

8–11 мая ўзорны дзіцячы тэатр «Вясёлка» Палаца культуры г. Барані прадстаўляў Беларусь на XV Міжнародным фестывалі-конкурсе «Невские перспективы» ў г. Санкт-Пецярбургу. Па выніках конкурсу юныя артысты сталі лаўрэатамі і дыпламантамі, а літаратурна-музычная кампазіцыя «Баллада о зенитчицах» паводле вершаў Р. Раждзественскага была ўключана ў гала-канцэрт фестывалю.

У маі культурны праект «З любоўю да малой радзімы» завітаў у Сітцаўскі СДК Докшыцкага раёна. Мясцовыя культработнікі арганізавалі мерапрыемства ў гістарычным парку. Асновай для правядзення святочнай праграмы стала некалі папулярная праграма савецкага тэлебачання «Ад усёй душы». Музычнае аздабленне фэсту было створана таленавітымі артыстамі сітцаўскага краю.

Вялікім святочным канцэртам адзначыў сваё 65-годдзе Альгоўскі сельскі Дом культуры Віцебскага раёна, які афіцыйна расчыніў свае дзверы ў 1954 годзе. Поўная зала ўдзячных гледачоў – верны знак прадаўжэння жыцця культурнай установы. (*Жыццё Прыдзвіння. – 2019. – 8 чэрв. – С. 4–5.*)

свята «Язэп Драздовіч: спадчына, традыцыі, інавацыі» завіталі прадстаўнікі мясцовай ўлады, работнікі культуры, вядомыя краязнаўцы Ада Райчонак і Кліменцій Кожан, супрацоўнік Пасольства ЗША ў Мінску Галіна Паўлоўская і інш. Навуковец Мікалай Плавінскі правёў прэзентацыю сваёй кнігі «Як жылі нашы продкі?» і аўтарскай работы «Асоба Язэпа Драздовіча ў гісторыі і культуры Беларусі». Выкладчык БДУ Віктар Малышчыц адкрыў фотавыставу «Беларусь у абдымках зор». Побач з музеем працаваў мабільны планетарый. Дарослыя тут убачылі фільм «Як нарадзілася зямля?», а для дзіцячай аўдыторыі дэманстраваліся пазнавальныя мультфільмы. Гучала музыка, працавала выстава-кірмаш народных рамёстваў. (*Кліч Радзімы. – 2019. – 1 чэрв. – С. 6.*)

У абласным цэнтры **21мая** была ўрачыста адкрыта мемарыяльная дошка першаму ваеннаму камісару Віцебскай губерніі Сямёну Крылову на вуліцы, якая носіць яго імя.

На фасадзе будынка СШ № 2 г. Віцебска **28 мая** была ўстаноўлена мемарыяльная дошка ў гонар выпускніка школы Віктара Варановіча, які загінуў пры выкананні інтэрнацыянальнага абавязку ў Афганістане.

У г. п. Коханава Талачынскага раёна адкрыццём памятнага знака была ўвекавечана памяць ваеннапалонных перасыльнага лагера «Дулаг-203», які існаваў там у 1941 годзе.

У рамках акцыі «Беларусь памятае» ў Барані адбылося адкрыццё мемарыяльнай дошкі ў гонар сям'і падпольшчыкаў Казлоўскіх, расстраляных фашыстамі.

II Міжнародная навуковая канферэнцыя «Праблемы гісторыі і культуры пагранічча» праведзена на базе Верхнядзвінскага раённага гісторыка-краязнаўчага музея. Яна была прымеркавана да значнай падзеі ў жыцці раёна – 200-годдзя Свята-Мікалаеўскай царквы. (*Дзвінская праўда. – 2019. – 11 чэрв. – С. 2.*)

20–21 чэрвеня на базе Расонскага музея баявой садружнасці была праведзена II навукова-практычная канферэнцыя «Расонскі край: гісторыя, культура, людзі», прымеркаваная да 225-годдзя з дня нараджэння

«Манаполія – Віцебск» і інш. Праграму «Музей особого назначения» прымеркаваў да Міжнароднага дня музеяў Віцебскі гарадскі музей воінаў-інтэрнацыяналістаў. Культурная акцыя «Ноч у музеі. Шэдэўры з мінулага» ў Оршы была прысвечана 25-годдзю музейнага комплексу гісторыі і культуры Аршаншчыны. У калегіуме езуітаў музейныя работнікі прадставілі экспанаты з усіх філіялаў і фондаў.Усе жадаючыя прымалі ўдзел у квэсце «25 тайн ордена иезуитов». Мерапрыемствы ў Глыбоцкім гісторыка-этнаграфічным музеі праходзілі пад дэвізам «Усе пакаленні – у музей!», а самым арыгінальным стаў фінал раённага конкурсу касплей-кіно «Cinema па-глыбоцку».

Музейныя работнікі старажытнага Полацка падрыхтавалі ўнікальныя праекты і выставы. У Сафійскім саборы экспанавалася выстава «Музейная скарбонка. Упрыгажэнні жыхароў Полацка і Полацкай зямлі X–XIII стагоддзяў». Музей беларускага кнігадрукавання запрасіў на выставу, прысвечаную апякуну беларускага адраджэння Б. Эпімаху-Шыпілу. Ля ўвахода ў Мастацкую галерэю працавала імправізаваная гравёрная майстэрня. У Музеі традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я з поспехам прайшла вечарына «Доктар Лён». У Доміку Пятра I гучала скрыпка. Кожны жадаючы мог прадэгуставаць традыцыйныя яўрэйскія стравы і завітаць на выставу сакральных камянёў. (*Полацкі веснік. – 2019. – 24 мая. – С. 4.*)

У Міжнародны дзень музеяў Бешанковіцкі раённы гісторыка-краязнаўчы музей правёў фестываль «Добро пожаловать к нам в гости!» Музейныя экспанаты з фондасховішчаў склалі выставу пад адкрытым небам «Музейный дворик». Дзецям былі прапанаваны віктарына «Угадай экспонат» і квэст «Тайны музейных предметов». Самых маленькіх наведвальнікаў зацікавіў дыяфільм «Ну, погоди!».

Маштабна і запамінальна прайшла акцыя «Ноч музеяў» у Германавічах Шаркаўшчынскага раёна. Мясцовы мастацка-этнаграфічны музей імя Язэпа Драздовіча арганізаваў шэраг мерапрыемстваў. Пачаліся яны з адкрыцця турыстычнага маршруту «Сцяжынкамі Драздовіча». На

8 чэрвеня на сцэне Глыбоцкага ГДК быў праведзены вакальны конкурс сямейных дуэтаў «Два галасы».

26 чэрвеня артысты народнага драматычнага тэатра Талачынскага раённага Цэнтра культуры і народнай творчасці паказалі гледачам драматычную баладу Аляксея Дударава «Не пакідай мяне» (рэжысёр Святлана Васільева).

ФЕСТЫВАЛІ, СВЯТЫ, КОНКУРСЫ

4 красавіка на сцэне Дома культуры чыгуначнікаў (г. Орша) прайшоў гала-канцэрт «Песні юнацтва нашых бацькоў» і вызначыў пераможцаў 25-га абласнога конкурсу.

У аграгарадку Калінаўка Дубровенскага раёна было праведзена раённае свята народнага календара «Гуканне вясны». Святочным тэатралізаваным шэсцем, абрадамі, карагодамі і гульнямі ўслаўлялі творчыя калектывы рэгіёна адраджэнне ў прыродзе. (*Дняпроўская праўда.– 2019. – 17 крас. – С. 5.*)

Фінальны тур раённага конкурсу «Прафесія!#культработнік» сярод маладых спецыялістаў Полацкага раённага Цэнтра культуры і яго падраздзяленняў прайшоў у рамках Свята працы і 115-годдзя прафсаюзнага руху ў Беларусі. Першае месца заваявала Дар'я Парфяненка з Азінскага СДК.

3–5 мая на Глыбоччыне прайшоў III Міжнародны фэст дударскіх рэгіёнаў «Дударскі рэй». У ім удзельнічалі музыканты з Польшчы, Македоніі, Харватыі. Беларусь прадстаўляў дудар Віталь Воранаў – ініцыятар і адзін з галоўных арганізатараў свята. Дудары выступілі на канцэртных пляцоўках Глыбокага і іншых населеных пунктаў раёна. У г. п. Падсвілле адбыліся традыцыйнае шэсце і гала-канцэрт. Майстры Дома рамёстваў падрыхтавалі для ўдзельнікаў фэсту прыгожыя сувеніры з выявай беларускай дуды, сімволікай музычнага свята.

Значным святам веснавога цыкла для беларусаў з'яўляецца «Юр'еў дзень», які адзначаюць **6 мая**. У Полацкім раёне ўжо не першы год цэнтрам

шырокіх юр'еўскіх гулянняў стаў аграгарадок Блізніца. У праграме: абрадавае дзеянне «Юр'еўскі каравай», бязмоўнае «Юр'еўскае шэсце», народныя забавы і гульні, арганізаваныя Полацкім РЦК, майстар-класы ад майстроў раённага Цэнтра рамёстваў і нацыянальных культур, выступленні творчых калектываў Багатырскага СДК і Вароніцкага СК, выхаванцаў філіяла «Блізніца» Полацкай ДШМ.

У **пачатку мая** ў Паставах адбылося раённае свята клёцак, праведзенае ў рамках агляду-конкурсу аматарскіх аб'яднанняў і клубаў па інтарэсах. Гэтая традыцыйная беларуская страва ў 2017 годзе была ўнесена ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. (*Пастаўскі край. – 2019. – 18 мая. – С. 5.*)

18 мая ў г. п. Шуміліна адбылося XV абласное свята гумару «Смяяцца не грэх». 29 творчых калектываў з 18 раёнаў (360 артыстаў) мелі магчымасць праявіць свае таленты і здольнасці ў разнастайных гумарыстычных жанрах. Сёлетні фестываль гумару ўпершыню праходзіў у вулічным фармаце. Стартавала дзейства на галоўнай плошчы райцэнтра з уручэння спадарожных лістоў 16 аўтаклубам для ўдзелу ў конкурсе «Вясёлы аўтобус». Сцэна ў гарадскім парку належала тэатрам мініяцюр і індывідуальным выканаўцам. Гран-пры атрымаў народны тэатр мініяцюр «Балаган» Лепельскага РДК.

25 мая на пляцоўцы каля Ерамееўскага СДК Дубровенскага раёна прайшоў раённы агляд фальклорных калектываў і ансамбляў песні «Народныя вытокі». Самадзейных артыстаў віталі жыхары і госці аграгарадка, якія ўпершыню сталі ўдзельнікамі свята ручніка «З ручніком ісці па жыцці».

Звыш 40 калектываў і салістаў з Беларусі, Расіі і Латвіі прымаў II Міжнародны фестываль ваенна-патрыятычнай песні «Солдаты Отечества», праведзены **25-26 мая** ў Віцебску. Песенны форум прысвячаўся 30-годдзю вываду савецкіх войскаў з Афганістана і 75-й гадавіне вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Гран-пры

Смаленскім рэгіянальным грамадскім рухам «Земляки». Групе краязнаўцаў былі ўручаны памятныя медалі.

«Вогненныя вёрсты вайны» – выстава пад такой назвай адкрылася **ў красавіку** ў Пастаўскім раённым краязнаўчым музеі.

У Віцебскім абласным музеі Героя Савецкага Саюза Міная Шмырова на працягу **мая – чэрвеня** экспанавалася выстава «Солдатская еда на фоне столетий» з прыватнай калекцыі Генадзя Дубініна.

8 мая ў Чашніцкім гістарычным музеі адкрылася выстава «Салют табе, салдат Перамогі!». Унікальны экспанат выставы – сцяг піянерскай арганізацыі, які, рызыкуючы сваім жыццём, зберагла ад фашыстаў настаўніца Гурэцкай сямігодкі Таццяна Валевіч.

17 мая ў канферэнц-зале Музея беларускага кнігадрукавання прэзентавалі новы праект «Natus vincere» («Рожденные побеждать»), прысвечаны гісторыі развіцця фізічнай культуры і спорту ў Полацку за апошнія 100 гадоў.

18 мая ў Міёрскім гісторыка-этнаграфічным музеі адкрылася выстава «Па шляхах арміі Андэрса». Экспазіцыя прысвечана ўраджэнцам краю, якія ваявалі супраць фашысцкіх захопнікаў у складзе II Польскага корпусу пад камандаваннем генерала Уладзіслава Андэрса.

Дню Перамогі і 75-годдзю вызвалення Віцебска і Віцебскай вобласці ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў быў прысвечаны адкрыты дыялог «Женское лицо Победы», праведзены ў Віцебскім абласным музеі Героя Савецкага Саюза М. П. Шмырова.

17–18 мая Віцебшчына актыўна падтрымала Міжнародную акцыю «Ноч музеяў-2019», якая праходзіла сёлета пад дэвізам «Музей як цэнтр культуры: будучыня традыцыі». Наведвальнікі Віцебскага абласнога краязнаўчага музея ўдзельнічалі ў квэстах, віктарынах, пазнаёміліся з музейнымі рарытэтамі, фатаграфаваліся з касцюміраванымі персанажамі эпохі Вялікага княства Літоўскага. У Арт-цэнтры Марка Шагала адкрылася выстава графікі М. Шагала з фондаў музея, дэманстраваўся дакументальны фільм пра знакамітага мастака, праводзілася пазнавальная гульня

Да 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у аграгарадку Акцябрская Віцебскага раёна была закладзена Алея Памяці і адкрыты мемарыяльны знак у гонар Героя Савецкага Саюза Пятра Шысцерава, які гераічна загінуў на тэрыторыі Акцябрскага сельсавета. Памятны знак і Алея Славы былі закладзены ўдзельнікамі рэспубліканскага суботніка ў парку Тысячагоддзя абласнога цэнтра.

У **красавіку – маі** ў Віцебскім музеі прыватнага калекцыяніравання экспанавалася калекцыя аўтарскай лялькі Наталлі Палікарпавай з г. Верхнядзвінска.

24 красавіка на Расоншчыне ўвекавечылі памяць вялікага флатаводца Іларыёна Павалішына. У гонар 280-годдзя з дня нараджэння віцэ-адмірала на яго магіле ў вёсцы Янкавічы быў усталяваны гранітны помнік. У Расонскім музеі баявой садружнасці прайшла тэматычная праграма, прысвечаная былому ўладальніку маёнтка Павалішына. Падзея аб'яднала дзве краіны – Беларусь і Расію. Ва ўрачыстасцях удзельнічалі кіраўнікі раёна, прадстаўнікі Беларускага саюза афіцэраў, грамадскага патрыятычнага руху «Морское братство – нерушимо!», госці з Растова-на-Доне і Мажайска. (*Витебские вести. – 2019. – 27 апр. – С. 4.*)

Браслаўскае раённае аб'яднанне музеяў напярэдадні 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў запусціла інтэрнэт-хроніку «Вялікай Айчыннай вайне прысвячаецца…». Інфармацыйныя банеры штотыднёва расказвалі пра падзеі, звязаныя з пачаткам вайны, акупацыйным перыядам на Браслаўшчыне і вызваленнем краю ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Аршанскі музей Уладзіміра Караткевіча **ў красавіку** арганізаваў выставу, прысвечаную 25-годдзю музейнага комплексу гісторыі і культуры Аршаншчыны.

Напярэдадні Дня Перамогі ў Віцебскім раённым гісторыка-краязнаўчым музеі прадстаўнікі грамадскасці, музейныя работнікі раёна і краязнаўцы сустрэліся з удзельнікамі расійска-беларускай патрыятычнай праграмы «Дороги войны. Дороги мира. Дороги памяти», якая рэалізуецца

быў прысуджаны групе «СССР», якая была створана ў 2005 годзе ў Мінску, а зараз прадстаўляла Смаленск.

25–26 мая ў Верхнядзвінску было праведзены XVIII рэгіянальнае дзіцячае свята мастацтваў «Двина-Дзвіна-Daugava», якое сабрала каля 300 прадстаўнікоў Беларусі, Расіі і Латвіі. Дзіцячыя творчыя калектывы паказалі высокі ўзровень майстэрства і багаты рэпертуар. Свята было насычана шматлікімі забаўляльнымі мерапрыемствамі, выставамі, конкурсамі, паказальнымі выступленнямі, танцавальнай праграмай. Усім ўдзельнікам святочнага канцэрта «Мой край родной, тебе поклон земной» былі ўручаны дыпломы і памятныя сувеніры.

«Бярозавы сок – здароўя глыток» – пад такой назвай **26 мая** было праведзена свята ў аграгарадку Бярозкі Докшыцкага раёна. Была арганізавана гульнявая пляцоўка «Бярозавы волат», праходзіў конкурс-дэгустацыя «Бярозавы фрэш», працавала «Бярозавая аптэка». На выставе-конкурсе мастацкай творчасці «Бярозкі дзіўнае святло» асаблівай папулярнасцю карысталіся скульптуры з бярозы.

Рэспубліканскае свята «Апошні званок» прайшло **30 мая** ў Лядовай арэне Оршы. Звыш 1700 адзінаццацікласнікаў з усіх куткоў Беларусі прыехалі ў маладзёжную сталіцу Беларусі 2019 года. Прывітанне выпускнікам даслаў Прэзідэнт Беларусі А. Р. Лукашэнка. Іх віншавалі міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь І. Карпенка і міністр культуры Ю. Бондар. У канцэртнай праграме выступілі лепшыя творчыя калектывы Аршаншчыны, вядомы спявак Іван Вабішчэвіч, групы «NaviBand» і «Без Билета».

1–2 чэрвеня адбылося Міжнароднае свята традыцыйнай культуры «Браслаўскія зарніцы». На творчую сустрэчу прыехалі спевакі, танцоры, артысты арыгінальнага жанру, клубы гістарычнай рэканструкцыі, якія прадставілі культурныя здабыткі Беларусі, Расіі, Польшчы, Латвіі, Літвы, Эстоніі і далёкага Эквадора. Праграма свята сярэднявечнай культуры «Меч Брачыслава», якім ўжо каторы год пачынаюцца «Браслаўскія зарніцы», была відовішчнай і цікавай.У міжнародным аглядзе-конкурсе харавых

калектываў «Браслаўская харавая асамблея» прынялі ўдзел 30 дзіцячых і дарослых калектываў. Наведвальнікаў свята ўразіла прэзентацыя панадворкаў «Браслаўскі фальварак», выступленне зводнага хору Віцебскай вобласці і гала-канцэрт. Прысутных весялілі гурт гістарычнага танца «1410» і вулічны тэатр «ВІР». (*Витебские вести. – 2019. – 4 июня. – С. 1, 4.*)

1 чэрвеня адбылося XI раённае свята народнай творчасці, беларускай паэзіі і фальклору «Гарадоцкі Парнас-2019» ва ўрочышчы Вараб'ёвы горы. Для гасцей мерапрыемства працавалі тэматычная пляцоўка «Гасцінны панадворак» з падворкамі «Тарасава сядзіба», «Рыбацкае шчасце», «Кветкавая паляна», «Банны панадворак», «Цешчыны бліны», «Мядовы панадворак»; выстава-продаж вырабаў народных майстроў, майстар-класы па ўнікальных рамёствах Гарадоччыны «Кірмаш ля Парнаса» і інш. Была арганізавана літаратурна-музычная праграма «Парнаская імпрэза» з удзелам вядомых паэтаў і творчых калектываў Гарадоччыны. Прайшоў танцавальны флэшмоб старадаўніх фальклорных танцаў «Скокі ва ўсе бокі», была праведзена спартландыя гарадоцкіх сем'яў. (*Гарадоцкі веснік. – 2019. – 4 чэрв. – С. 1, 5.*)

7–9 чэрвеня ў Паставах быў праведзеы XXX Міжнародны фестываль народнай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік». Адначасова шырока адзначылі два юбілеі: 610-годдзе горада і 30-годдзе свята народнай музыкі. Сёлета гасцямі свята сталі творчыя калектывы з Расіі, Польшчы, Грузіі, краін Балтыі. Старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў У. У. Цярэнцьеў на ўрачыстым адкрыцці свята акцэнтаваў увагу на тым, што фестываль з'яўляецца месцам захавання і папулярызацыі народнай культуры і традыцый. Напоўнены песнямі, інструментальнымі і харэаграфічнымі кампазіцыямі, фестываль прадэманстраваў багацце нацыянальных культур розных народаў. (*Витебские вести. – 2019. – 11 июня. – С. 1, 5.*)

9 чэрвеня ў Оршы ўпершыню прайшоў фестываль пад назвай «Орша – колыбель льна». У праграме: касцюміраванае шэсце «Льняное

ДУК «Шумілінская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

У красавіку стартаваў раённы агляд-конкурс «Библиотека в поддержку развития чтения». Першае паказальнае мерапрыемства ў выглядзе тэатралізаванага прадстаўлення «Вовка в Тридевятом царстве» прайшло ў бібліятэцы «Дабееўскі мох».

26 красавіка ў ЦРБ адбылася тэматычная сустрэча з ліквідатарамі «Чернобыль – черная быль нашей истории».

30 красавіка ў рамках адкрыцця раённай Дошкі Гонару адбылася прэзентацыя інтэрактыўнай выставы «Ими гордится Шумилино».

19 мая ў рамках раённага агляду-конкурсу «Библиотека в поддержку и развитие чтения» ў Мішневіцкай сельскай бібліятэцы была праведзена літаратурна-музычная кампазіцыя «Без памяти нет совести». Гучалі вершы паэтаў-франтавікоў і ваенныя песні. Яркім момантам стала тэатралізаваная пастаноўка па матывах кнігі Б. Васільева «А зори здесь тихие».

24 мая ў ЦРБ прайшла творчая сустрэча з пісьменніцай Вольгай Маслюковай.

21 чэрвеня ў чытальнай зале дзіцячай бібліятэкі прайшоў урок мужнасці «Страницы памяти священной».

23 чэрвеня ў ЦРБ была праведзена вечарына-партрэт «И плывут, и летят эти чудные звуки» ў гонар 70-гадовага юбілею таленавітага земляка – паэта, кампазітара, спевака Анатоля Міхеева.

МУЗЕЙНАЯ СПРАВА І АХОВА ПОМНІКАЎ

11 красавіка ў Расонскім музеі баявой садружнасці была арганізавана сустрэча былых вязняў фашысцкіх канцлагераў, прадстаўнікоў райвыканкама і грамадскіх арганізацый. Работнікі музея падрыхтавалі гісторыка-літаратурную кампазіцыю «Память стучит набатом».

гістарычная кампазіцыя «Памятаем. Ганарымся. Шануем!», прысвечаная 75-годдзю вызвалення Чашніцкага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

ДУК «Шаркаўшчынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

11 красавіка ў сувязі з Міжнародным днём вызвалення вязняў фашысцкіх канцлагераў на сустрэчу са школьнікамі ў дзіцячую бібліятэку былі запрошаны жыхары раёна – сведкі таго страшнага часу, былыя малалетнія вязні лагераў смерці. У межах мерапрыемства была прадстаўлена кніга «Дзеці вайны».

У раённай бібліятэцы напярэдадні Вялікадня адбылася прэзентацыя бібліятэчнай выставы «Светлая Пасха Хрыстова».

17 мая ў сістэме адбыўся семінар на тэму «Айчына. Здароўе. Спорт». За круглым сталом бібліятэкары гутарылі аб значэнні спорту ў жыцці чалавека. Прагучалі метадычныя парады аб формах і метадах папулярызацыі спорту ў бібліятэках сістэмы. Электронная прэзентацыя пазнаёміла ўдзельнікаў семінара з зоркамі беларускага спорту. Праверыць свае веды пра віды спорту, здаровы лад жыцця дапамагла віктарына «Спорт. Здароўе. Даўгалецце».

Да Года малой радзімы ў Радзюкоўскай бібліятэцы распрацаваны і праведзены краязнаўча-турыстычны экскурс «Радзюкоўская зямля – зямля тваіх бацькоў».

У рамках рэалізацыі мерапрыемстваў па праграме «Ад роднай мовы і культуры да чалавецтва крок зрабі» бібліятэкары Лужкаўскай бібліятэкі правялі казачную гульню-азбуку «В летний день читать не лень», прымеркаваную да Дня абароны дзяцей.

19 чэрвеня ў Каўшэлеўскай бібліятэцы адбыўся літаратурны вечар «Франтавыя дарогі Васіля Быкава», прысвечаны 95-годдзю з дня нараджэння народнага пісьменніка.

великолепие», паказ мод «Льняное дефиле», выстава-кірмаш вырабаў майстроў народнай творчасці, канцэрт, падрыхтаваны работнікамі гарадского Палаца культуры «Орша» з удзелам творчых калектываў раёна і артыстаў беларускай эстрады, святочны феерверк.

14–16 чэрвеня адбыўся XXVI Міжнародны фестываль песні і музыкі «Дняпроўскія галасы ў Дуброўне». Праграма форуму была насычана мерапрыемствамі, прысвечанымі Году малой радзімы. Гэта работа тэатралізаваных падворкаў «Дубровеншчына гасцінная», свята-конкурс аркестраў народных інструментаў «Спяваем з аркестрам», свята-конкурс традыцыйнай лялькі «Лялька Дубравушка запрашае», VI раённы мастацкі пленэр «Дубровенскія краявіды». У выставачнай зале гісторыка-краязнаўчага музея адкрылася выстава, прысвечаная 325-годдзю гравіраванай бібліі Васіля Кораня. Рэканструяваную «Біблію для народа», якую стварыў ураджэнец Дубровеншчыны, майстар народнага лубка Васіль Корань, перадалі дубровенцам гравёры з Акадэміі народнага мастацтва Расіі. Знакавай падзеяй фестывалю стаў паказ спектакля «Не пакідай мяне» Аляксея Дударава ў пастаноўцы Драматычнага тэатра Беларускай арміі на сцэне РДК. (*Витебские вести. – 2019. – 18 июня. – С. 1, 5.*)

15 чэрвеня ў Малых Лётцах Віцебскага раёна прайшоў раённы фестываль «Волаты Прыдзвіння», прысвечаны ўраджэнцу гэтых мясцінаў Фёдару Махнову. Распачалося свята маляўнічым шэсцем-карнавалам па вуліцах вёскі. Святочную атмасферу стваралі самадзейныя артысты і творчыя калектывы. На фэсце была наладжана праца адкрытых інтэрактыўных пляцовак, экскурсій і выстаў. Госці, сярод якіх былі і праўнучкі Ф. Махнова з Масквы і Разані, наведалі гістарычны фотасалон, майстар-класы народных умельцаў, адчынены летась «Парк Веліканаў», які сёлета папоўніўся новымі арт-аб’ектамі. У гэтым годзе тут адкрылі яшчэ і «Парк мініяцюр». (*Витьбичи. – 2019. – 22 июня. – С. 16.*)

16 чэрвеня ў аграгарадку Астроўна Бешанковіцкага раёна ў трэці раз правялі раённае свята духоўнай культуры і народнай творчасці «Траецкі фестываль». У праграме: Боская літургія, «Кірмаш рамёстваў»,

выступленні дзіцячых тэатральных калектываў, тэматычнае мерапыемства РАНС «Ярмарка безопасности», канцэрт творчых калектываў і салістаў, траецкія пачастункі і інш. Напярэдадні свята былі праведзены траецкія духоўныя чытанні.

Традыцыйным стала правядзенне ў першы дзень Святой Тройцы свята нацыянальнай культуры «Зберагаем вытокі свае» ў аграгарадку Таргуны Докшыцкага раёна. У праграме сёлетняга свята: траецкі кірмаш, старажытны абрад кумавання, конкурс музыкаў «Іграй, гармонік!», выступленне народнага ансамбля «Прызбачка» з Валкалат.

23 чэрвеня ў чацвёрты раз ў аграгарадку Завозер'е Полацкага раёна было праведзена свята народнага майстэрства, традыцыйных ведаў і добрасуседства «Завозерская беразуха-2019». Арганізатары – Полацкі РЦК, Завозерскі СДК і Гомельскі сельвыканкам. Цікавасць выклікаў конкурс «Девица-краса – березовая коса». У фэсце добрасуседства «Мы с соседями друзья – мы одна семья» прынялі ўдзел шматдзетныя сем'і. Творчую фантазію праявілі стваральнікі бярозавых венікаў. У канцэртнай праграме ўдзельнічалі мясцовыя артысты, прадстаўнікі Багатырскага СДК і вакальны калектыў «Ушачаначка» з Ушач.

28 чэрвеня ў Культурна-гістарычным комплексе «Залатое кальцо горада Віцебска «Дзвіна» было арганізавана латышскае народнае свята «Ligo».

29 чэрвеня ў г. п. Лёзна адбылося XII абласное свята-конкурс «Песні сунічных бароў». Удзел у мерапрыемстве прынялі творчыя дэлегацыі Жытомірскай вобласці Украіны, горада Даўгаўпілса Латвійскай Рэспублікі, Руднянскага, Веліжскага раёнаў і горада Смаленска Расійскай Федэрацыі, 15 раёнаў Віцебскай вобласці. Свята прысвячалася 75-годдзю з дня вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Былі ўскладзены кветкі на цэнтральных вайсковых могілках, прайшла акцыя «Беларусь памятае». Яскравай нотай мерапрыемства стала тэатралізаванае шэсце «Зямля сунічных бароў збірае сяброў». Упершыню ў раёне прайшла акцыя «Чытаем разам». Для чытання было выбрана апавяданне «Васількі»

для дзяцей праводзіліся ўрокі бяспечных паводзін на вадзе і на дарогах. Да Дня ўсенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны прайшлі вахты памяці «Всем, кто спит под обелиском, поклонитесь низко-низко, были афармлены выставы «Память огненных лет».

ДУК «Ушацкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

У красавіку была праведзена пазнавальная гадзіна «Путешествие в страну её Величества Книги» (Глыбачанская с/б) і пазнавальна-конкурсная гадзіна да Міжнароднага дня птушак «Крылатый почтальон и пернатый чемпион» (Слабодская бібліятэка-клуб).

14 мая ў Глыбачанскай с/б прайшла інфармацыйная гадзіна «Дзяржаўная сімволіка» да Дня Дзяржаўнага Герба і Дзяржаўнага Сцяга Рэспублікі Беларусь.

17 мая ў дзіцячай бібліятэцы адбылося пасяджэнне аматарскага аб'яднання «Літаратурнае кафэ» да Міжнароднага дня сям'і. З вучнямі 5 «А» класа Ушацкай СШ была праведзена гульня-конкурс «Читали мамы, папы – теперь читаем мы».

1 чэрвеня ў Вялікадолецкай бібліятэцы праведзена пазнавальная гульня «Давайте за руки возьмёмся» да Міжнароднага дня абароны дзяцей.

ДУК «Чашніцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

9 мая на гарадскім свяце бібліятэкары прынялі ўдзел у арганізацыі адкрытага паэтычнага марафону «Вершы, як памяць пра вайну», прысвечанага 74-гадавіне Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Удзел у марафоне прынялі ўсе жадаючыя, без абмежавання ўзросту. Гучалі вершы К. Сіманава, С. Міхалкова, К. Крапівы, Н. Гілевіча, А. Вярцінскага і вершы ўласнага сачынення.

Супрацоўнікамі раённай бібліятэкі быў распрацаваны аўтамаршрут памяці «Мы перамаглі!», які ажыццяўляўся на бібліёбусе. У рамках маршруту для жыхароў аддаленых вёсак праводзілася літаратурна-

Дзень абароны прыроды «Прыроду ведаю, абараняю, берагу!» прайшоў **5 чэрвеня** ў дзіцячай бібліятэцы імя Л. Талстога.

12 чэрвеня ў рамках краязнаўчай праграмы «Мая Полаччына» ў бібліятэцы-філіяле № 8 быў праведзены ўрок праваслаўнай культуры «Дачка зямлі Полацкай» (да Дня памяці Е. Полацкай) для вучняў школьнага лагера СШ № 16.

19 чэрвеня ў бібліятэцы-філіяле імя А. Герцэна прайшла патрыятычная гадзіна «Крэпасць Полацк стаяла непарушна».

ДУК «Сенненская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

Да Дня яднання народаў Беларусі і Расіі ў бібліятэках сістэмы былі афармлены кніжныя выставы «У нас единая планета, у нас единая семья». У Багданаўскай с/б правялі вусны часопіс «Дзве мовы сталі блізкімі», у Пламенскай с/б – гадзіну інфармацыі «Зямлі адзінай людзі».

10 красавіка супрацоўнікамі ЦРБ была арганізавана сустрэча-ушанаванне валанцёраў ініцыятыўнай групы «Живи, «Родник», живи» ў сувязі з 10-годдзем яе заснавання.

11 красавіка Міжнароднаму дню вызвалення вязняў фашысцкіх канцлагераў была прысвечана сустрэча «Детство, опалённое войной», арганізаваная ЦРБ сумесна з аўтаклубам РЦКіНТ.

Да Міжнароднага дня Зямлі Машканская с/б правяла краязнаўчае эка-падарожжа «Маёй Радзімы любыя мясціны».

24 красавіка ў ЦРБ прайшоў семінар для сельскіх бібліятэкараў «Популяризация здорового образа жизни среди населения: инициатива и взаимодействие».

У **маі** бібліятэкі сістэмы афармілі кніжна-інфармацыйныя выставы «Труд славит человека» (да Дня працы), кніжныя выставы «Помним, не забудем никогда», правялі вахты памяці «Спасибо солдатам Победы за то, что не знали войны».

У **чэрвені** ў бібліятэках праходзілі мерапрыемствы ў рамках рэспубліканскай інфармацыйна-асветнай акцыі «Беларусь против табака»,

Міхася Лынькова з нагоды 120-годдзя з дня нараджэння пісьменніка-земляка. Адбыліся адкрыты агляд-конкурс паэтычных клубаў вобласці на літаратурнай пляцоўцы «Пад сунічным абажурам» і конкурс самадзейных кампазітараў. Быў адкрыты памятны знак «Сунічныя бары» – сімвал фестывалю. Другой часткай мерапрыемства стала святкаванне Дня моладзі» – «Віват, моладзь!». (*Сцяг перамогі. – 2019. – 2 ліп. – С. 4–5.*)

29 чэрвеня ў аграгарадку Башні Шумілінскага раёна быў праведзены «Водны фестываль» у гонар возера Будавесць. З канцэртнай праграмай прыехалі самадзейныя артысты з грамадскага аб’яднання «Залаты ўзрост» (г. Віцебск). Мясцовы клуб падрыхтаваў тэатралізаваную пастаноўку «Як Арцём ваду шукаў». З канцэртам «На ўсіх ветразях» завітаў аздараўленчы лагер «Пунсовы ветразь» з Лескавіч. У праграме свята: работа фотазоны, інфармацыйнага стэнда грамадскага аб’яднання «Экабум», конкурсная праграма з віктарынай «Вадой не разальеш» і інш.

БІБЛІЯТЭЧНАЯ СПРАВА

11 мая ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі былі падведзены вынікі XXVII рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры» за 2018 год. У намінацыі «За пошукавую і даследчую працу» лепшай сярод гарадскіх і раённых бібліятэк прызнана Шаркаўшчынская раённая бібліятэка. Вынікам работы па творчай спадчыне Язэпа Драздовіча стаў бібліяграфічны дапаможнік «Вандроўнік. Доўгае вяртанне» і зборнік матэрыялаў «Адсюль твой пачатак і тут твой працяг». У намінацыі «За падтрымку і развіццё чытання» другую прэмію сярод гарадскіх і раённых бібліятэк атрымала Цэнтральная бібліятэка Браслаўскага раёна за папулярызацыю літаратуры і актывізацыю інтарэсу да кнігі праз рэалізацыю шэрагу праектаў: праект-краязнаўчая эстафета «Беларускае! Роднае! Сваё!»; праект «Сям’ю яднае мудрасць кніг»; крэатыў-праект «Библиотека вне стен»; праект «Свабодная вулічная бібліятэка». (*Краязнаўчая газета. – 2019. – № 24 (чэрв.). – С. 5–6.*)

Каля 150 дэлегатаў сталі ўдзельнікамі Рэспубліканскай школы дырэктараў бібліятэк, якая прайшла **13–14 чэрвеня** на базе ДШМ № 1 г. Оршы. Арганізатары – Міністэрства культуры, Нацыянальная бібліятэка Беларусі, Аршанскі райвыканкам і Аршанская ЦБС. Удзельнікі школы абмеркавалі стан і перспектывы развіцця бібліятэчнай справы ў краіне.

ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна»

2 красавіка была праведзена літаратурная вечарына «Паэзія і музыка вясны» сумесна з Віцебскім абласным аддзяленнем ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі».

4 красавіка ўвазе наведвальнікаў было прапанавана звыш 700 кніг рознай тэматыкі на выставе-праглядзе аддзела абанемента і МБА «Свет новых выданняў».

4 красавіка адбыліся чарговыя заняткі бясплатных курсаў «Віцебск: рэальная і папулярная гісторыя роднага горада» на тэму «Фамільная гісторыя сям'і Цшохераў». Перад слухачамі курсаў выступіў кіраўнік праекта «Таварыства сяброў школы Карла Мая» Мурат Валіеў (г. Санкт-Пецярбург).

5 красавіка прайшла прэзентацыя інфармацыйна-асветніцкага выдання «Беларускі фронт» з серыі «Залатая Кніга Санкт-Пецярбурга», якую прадставіў С. В. Грыгор'еў – старшыня ГА «Залатая Кніга Санкт-Пецярбурга».

9 красавіка ў нямецкай чытальнай зале адбылася творчая майстэрня для школьнікаў, прымеркаваная да святкавання Вялікадня.

Супрацоўнікі электроннай чытальнай залы падрыхтавалі on-line выставу «Кладовая здоровья», прысвечаную народнай медыцыне.

10 красавіка адбылося адкрыццё выставы работ удзельнікаў студыі творчасці для дарослых «HAPPY-ART» «Пад небам блакітным», прысвечанай Году малой радзімы.

10 красавіка прайшла інфармацыйная кампанія па распаўсюджанні ведаў у сферы псіхічнага здароўя «Клопат тут!».

сустрэлі разам з ветэранамі, сябрамі, чытачамі **12 красавіка** ў раённым Цэнтры культуры. Падзякі і Ганаровыя граматы, віншавальныя лісты і музычныя падарункі атрымалі людзі, якія цалкам аддавалі і аддаюць сябе любімай справе. (*Полацкі веснік. – 2019. – 12 крас. – С. 5. ; 19 крас. – С. 6.*)

10 красавіка ў бібліятэцы-філіяле № 5 адбылося свята «І ўсміхнецца дзецям казка», прысвечанае Міжнароднаму дню дзіцячай кнігі. На свята былі запрошаны ўдзельнікі клуба «Натхненне».

У бібліятэцы імя Я. Купалы **17 красавіка** прайшоў літаратурны партрэт «Жыццё – як сюжэт для серыяла», прысвечаны 95-годдзю з дня нараджэння пісьменніка Алеся Савіцкага; **25 красавіка** была праведзена краязнаўчая гульня-квэст «Полацк вядомы і невядомы» паміж навучэнцамі СШ № 6, СШ № 8 і ДУА «Полацкае кадэцкае вучылішча»; **29 красавіка** для школьнікаў правялі інфармацыйную гадзіну «Свята Вясны і Працы», прымеркаваную да дня 1 Мая.

24 красавіка ў бібліятэцы імя Л. Талстога выхаванцы дзіцячага садка № 7 прымалі ўдзел у пазнавальна-забаўляльнай праграме «Мы сустракаем Першамай!», якая прайшла ў школе маленькіх кнігалюбаў «Ступеньки». У гэты дзень ў бібліятэцы-філіяле № 8 праходзілі тэатралізаваныя экскурсіі «Вас запрашае бібліятэка!» для дашкольнікаў.

3 мая ў бібліятэцы імя. А. Герцэна адбылася вечарына «И помнит мир спасённый...».

14 мая ў дзіцячай бібліятэцы імя Л. Талстога прайшла краязнаўчая сустрэча вучняў 9-х класаў СШ № 10 з пісьменнікам і краязнаўцам Віктарам Карасёвым.

17 мая ў бібліятэцы-філіяле № 8 да Міжнароднага дня сям'і ў рамках праекта «Усё пачынаецца з сям'і» было праведзена сямейнае свята «Семья – любви великой царство».

20 мая ў бібліятэцы імя Я. Купалы ў межах індывідуальнага творчага плана па папулярызацыі беларускай кнігі «Далучыць да роднага слова» прайшла лесвіца-славесніца «Падарожжа ў Краіну Слоў». На ёй прысутнічалі вучні 4 «В» класа СШ № 8 г. Полацка.

ДУК «Пастаўская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

5 красавіка адбылася літаратурна-музычная гасцёўня «Романса трепетные звуки грустят тревожно и светло» ў клубе па інтарэсах «Сучаснікі» пры ЦРБ.

8–12 красавіка ў дзіцячай бібліятэцы імя У. Дубоўкі прайшоў Тыдзень дзіцячай і юнацкай кнігі. Мерапрыемствы Тыдня: ранішнік «С книгой весело шагать» , прагляд кніг «Вялікая любоў да малой Радзімы», літаратурнае падарожжа «Приглашает книжкин дом» і інш.

24 мая на базе Юнькаўскай с/б прайшоў раённы семінар бібліятэчных работнікаў «Краязнаўчая дзейнасць бібліятэк як сродак фарміравання грамадзянскай культуры насельніцтва». Адбыўся абмен вопытам работы. Быў прадэманстраваны фільм-ролік «Віртуальнае падарожжа па зоне абслугоўвання», створаны бібліятэкарам Юнькаўскай с/б М. М. Касцюк. Было праведзена віртуальнае падарожжа «Сцежкамі роднага краю» з удзелам вучняў Юнькаўскай школы.

4 чэрвеня Варапаеўская гарпасялковая бібліятэка правяла прававую гульню «Выборы президента сказочной страны» з дзіцячым чытачом школьнага аздараўленчага лагера «Вяселы вулей».

7 чэрвеня работнікі ЦРБ правялі літаратурнае свята-падарожжа «І будзе слова землякоў гучаць над роднаю старонкай» у рамках XXX Міжнароднага фестывалю народнай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік».

ДУК «Полацкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

У **красавіку** Полацкая ЦРБ імя Ф. Скарыны адзначыла 100-гадовы юбілей. Створаная ў 1919 годзе, яна і зараз займае значнае месца ў культурным жыцці Полацка. У рамках юбілейнага тыдня былі наладжаны мерапрыемствы: квэст «Таямніцы бібліятэкі», відэакруіз «Бібліятэка і час: новыя рэаліі», пазнавальная гадзіна «Бібліятэка. Новы фармат», віртуальнае падарожжа «В «100 лет» вместе с нами», выстава «Гісторыя бібліятэкі: людзі, лічбы, факты». Юбілейную дату супрацоўнікі бібліятэкі

11 красавіка адбылося адкрыццё выставы «БИЖУмно самоцветное настроение». У экспазіцыі – аўтарскія ўпрыгожванні з натуральных камянёў майстра Іны Брыль.

11 красавіка ў рамках праекта «Школа фінансавай пісьменнасці для дзяцей» для малодшых школьнікаў была арганізавана інтэлектуальна-пазнавальная гульня «Юны фінансіст».

15 красавіка ў аддзеле літаратуры па мастацтве ў рамках бібліятэчнага праекта «Музыка для ўсіх» адбылася лекцыя члена Беларускага саюза кампазітараў, музыканта і педагога Аляксандра Іванова «Адзін супраць лёсу», прысвечаная жыццю і творчасці кампазітара Людвіга ван Бетховена.

17 красавіка ў бібліятэцы адбылася творчая вечарына віцебскага барда, паэта, аўтара-выканаўцы Пятра Захарава «У коле сяброў».

18 красавіка на пасяджэнні дзіцячага клуба «Правазнайка» была праведзена інтэлектуальная гульня «Героі кніг маюць права».

18 красавіка ў сектары замежнай літаратуры прайшла літаратурная гадзіна для малодшых школьнікаў «А яичко не простое...», прымеркаваная да Міжнароднага дня кнігі і Вялікадня.

22 красавіка ў нямецкай чытальнай зале прайшла лекцыя для слухачоў курсаў павышэння кваліфікацыі ўстановы «Віцебскі абласны інстытут развіцця адукацыі».

23 красавіка ў бібліятэцы ў рамках цыкла мерапрыемстваў «Да 75-годдзя вызвалення Віцебскай вобласці ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў» адбыўся тэматычны вечар «Каб памяталі...», прысвечаны памяці вязняў канцлагераў і гета, які прайшоў пад дэвізам «Беларусь памятае». У мерапрыемстве прынялі ўдзел прадстаўнікі ветэранскіх арганізацый, гарадской яўрэйскай абшчыны, маладзёжнага актыву, былыя малалетнія вязні фашысцкіх канцлагераў, грамадскасць горада.

24 красавіка ў бібліятэцы прайшоў абласны фестываль бібліятэчных тэатраў кнігі і лялечных тэатраў «Чароўная рампа». Свае

творчыя таленты прадэманстравалі восем тэатральных калектываў з розных куткоў вобласці: Сянно, Віцебска, Наваполацка, Лепеля, Талачына, Бешанковіцкага і Полацкага раёнаў. У складзе калектываў былі не толькі супрацоўнікі бібліятэк, але і іх таленавітыя юныя чытачы. Аднадушным рашэннем журы Гран-пры фестывалю атрымаў «Тэатр кнігі Васі Вясёлкіна» Вярхоўскай сельскай бібліятэкі-філіяла № 8 Бешанковіцкай ЦБС за тэатральную пастаноўку «Тры палёўкі – тры сястры» (па матывах казкі Р. Баравіковай).

27 красавіка адбылася сустрэча з членамі РГА «Беларускі літаратурны саюз "Полоцкая ветвь"».

2 мая ў аддзеле краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі адбылася прэзентацыя чарговай кнігі вядомага празаіка, сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў Франца Сіўко «Раз – шкілет, і два – шкілет.

2 мая адбылося адкрыццё абласной выставы-конкурсу мастакоў-аматараў «Мая сям'я», прысвечанай 75-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Перамозе савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

14 мая супрацоўнікі агульнай чытальнай залы правялі літаратурна-музычную вечарыну «Всю жизнь была я на переднем крае...», прысвечаную 95-годдзю з дня нараджэння рускай савецкай паэтэсы Юліі Друнінай.

16 мая ў рамках курсаў «Віцебск: рэальная і папулярная гісторыя роднага горада» адбылася прэзентацыя новых кніг Аркадзя Падліпскага з серыі «Биография витебского дома». У 2017 годзе А. Падліпскі за аўтарскую публіцыстычную краязнаўчую серыю «Биография витебского дома» стаў лаўрэатам «Літаратурнай прэміі імя Петруся Броўкі» Віцебскага аблвыканкама.

21 мая адбыўся музычны вечар «Мы такія розныя, гэтым і прыгожыя мы», арганізаваны сектарам замежнай літаратуры да Міжнароднага дня культурнай разнастайнасці ў імя дыялогу і развіцця.

22 мая ў бібліятэцы прайшоў творчы вечар трыа «Каўчэг» «Наш шлях. Праз 17 гадоў...».

строка», у якую ўвайшлі 25 гісторый жыхароў Лёзна пра родных і блізкіх, якія прымалі ўдзел у баях за Беларусь.

ДУК «Міёрская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

11 красавіка ў ЦРБ была праведзена інфармацыйная гадзіна «Памяці вязняў фашысцкіх канцлагераў прысвячаецца...» для вучняў 4 і 5 класаў СШ № 3 райцэнтра.

23 красавіка адзначаўся Сусветны дзень кніг і аўтарскага права. Раённая бібліятэка арганізавала сустрэчу з таленавіым чалавекам – Сафіяй Гуз. Нягледзячы на поўную адсутнасць зроку, яна піша вершы, займаецца дэкаратыўна-прыкладной творчасцю, садоўніцтвам, кулінарыяй. Яе работы і паэтычныя зборнікі «На крылах маёй мары» і «Каханне без межаў» былі прадстаўлены на выставе «Бачыць свет сэрцам».

17 мая да Міжнароднага дня сям'і ў дзіцячай бібліятэцы сваю чарговую сустрэчу правёў сацыяльна-педагагічны цэнтр. Членамі клуба «Островок надежды» з'яўляюцца дзеці з прыёмных сем'яў і дзіцячых дамоў сямейнага тыпу і іх мамы. Кожная прынесла з сабой «Кнігу жыцця» – альбом-дзённік пра дамашнія і школьныя справы, захапленні, падарожжы і святы. Бібліятэкары падрыхтавалі выставу-агляд «Под парусом семьи лежит планета детства» і пазнаёмілі з новай дзіцячай літаратурай.

31 мая ў ЦРБ прайшла вулічная моладзевая акцыя «Кідай курыць у рэальным часе!", прысвечаная Сусветнаму дню барацьбы з курэннем. У праграме: кніжная выстава «Дыхай свабодна – жыві доўга», віктарына «За жыццё без тытунёвага дыму», адкрыццё інтэрактыўнай дошкі «Забей на курение», прагляд відэафільма «Сакрэты маніпуляцыі. Тытунь».

1 чэрвеня ў дзіцячай бібліятэцы адбылося свята дзяцінства, якое наведалі вучні малодшых класаў Чапукоўскай і Дварнасельскай школ. Для іх была арганізавана гульнёвая праграма «На шчаслівай хвалі дзяцінства».

8 чэрвеня работнікі дзіцячай бібліятэкі правялі вулічны хіт-парад «Кніжны квартал».

У ЦРБ да Дня здароўя **5 красавіка** прайшла акцыя «К здоровью с книгой». З **8 па 15 красавіка** ў аддзеле па рабоце з дзецьмі традыцыйна прайшоў Тыдзень дзіцячай кнігі, які быў прысвечаны Году малой радзімы і 75-годдзю вызвалення Беларусі. **18 красавіка** ў рамках праекта «Путь к профессии через библиотеку» для старшакласнікаў СШ № 1 г. п. Лёзна быў праведзены прафарыентацыйны навігатар «Профессиональное самоопределение».

8 мая ў ЦРБ прайшоў Дзень гераічнай памяці «Через всё прошли и победили…». Супрацоўнікі і наведвальнікі бібліятэкі прынялі актыўны ўдзел у літаратурна-патрыятычных акцыях «Стихи, ставшие песней», «Чтобы помнили! Стихи о войне до слёз...». У фае бібліятэкі была прадстаўлена выстава-панарама «В книжной памяти мгновения войны», на працягу дня дэманстраваліся відэаролікі ваеннай тэматыкі «Песня таксама ваявала».

Да 75-годдзя аперацыі «Багратыён» і вызвалення Беларусі ў аддзеле па рабоце з дзецьмі ЦРБ адкрылася выстава-гаворачая сцяна памяці «С востока на запад шагала Победа». На ёй прадстаўлены гістарычныя дакументы, матэрыялы перыёдыкі, плакаты, фота і паштоўкі з фондаў бібліятэкі, якія звычайна знаходзяцца ў кнігасховішчах і недаступныя для чытачоў. Дапоўнілі выставу сапраўдныя прадметы ваеннага часу, прадастаўленыя ваенна-гістарычным музеем.

З **31 мая па 21 чэрвеня** ў ЦРБ прайшла акцыя «Меняй никотин на витамин!» у рамках Сусветнага дня без тытуню і рэспубліканскай інфармацыйна-адукацыйнай акцыі «Беларусь против табака».

1 чэрвеня ў гарадскім парку традыцыйна праведзена свята Дзяцінства, на якім быў дадзены «Кніжны старт у лета».

Напярэдадні 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў аддзел па рабоце з дзецьмі ЦРБ у рамках гістарычнага пошуку «Лиозненцы на войне. Война на Лиозненщине» выпусціў новую, пятую кнігу «Белорусские вёрсты Победы. Лиозненская

23 мая быў праведзены ўрок права «Я люблю сваю краіну, дзе ёсць права на імя і на сям'ю» для ўдзельнікаў дзіцячага клуба «Правазнайка».

30 мая ў бібліятэцы прайшло пасяджэнне грамадскага каардынацыйнага экалагічнага савета пры Віцебскім абласным камітэце прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Галоўны бібліятэкар сектара сацыякультурнай дзейнасці і маркетынгу Віцебскай абласной бібліятэкі Таццяна Лузан падзялілася вопытам работы публічных бібліятэк Віцебскай вобласці і Віцебскай абласной бібліятэкі па фарміраванні экалагічнай культуры насельніцтва. Бібліятэкар аддзела перыядычных выданняў Алена Брускова правяла бібліяграфічны агляд часопісаў з фонду абласной бібліятэкі, у якіх асвятляюцца пытанні экалогіі. Супрацоўнікі агульнай чытальнай залы падрыхтавалі да мерапрыемства кніжную выставу «Экалогія. Прырода. Жыццё».

2 чэрвеня ў рамках міні-праекта «90 гадоў у коле сяброў...» у сектары замежнай літаратуры адбылася інтэлектуальная гульня «БиблиоGame».

13–14 чэрвеня ў рамках XXXIX Міжнародных Ганзейскіх дзён Новага часу ў Пскове адбылася Міжнародная навукова-практычная бібліятэчная канферэнцыя «Культура памежжа». З выставачнай дзейнасцю Віцебскай абласной бібліятэкі прысутных пазнаёміла загадчык аддзела літаратуры па мастацтве Алена Васілеўская.

18 і **19 чэрвеня** ў сектары замежнай літаратуры адбыўся квэст па-англійску «У пошуках кароны каралевы» для малодшых школьнікаў лінгвістычных лагераў ДУА «Гімназія № 2 г. Віцебска» і ДУА «Сярэдняя школа № 28 г. Віцебска».

19 чэрвеня ў бібліятэцы адбылася літаратурная вечарына «Я перад вамі з памяццю сваёй...», прысвечаная 95-годдзю з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава. Вечарына была наладжана сумесна з Віцебскай абласной арганізацыяй ГА «Таварыства беларускай мовы імя Францыска Скарыны».

6, 11, 19 чэрвеня супрацоўнікамі нямецкай чытальнай залы быў праведзены шэраг мерапрыемстваў для вучняў школ з паглыбленым вывучэннем нямецкай мовы.

25 чэрвеня ў бібліятэцы ў рамках цыкла мерапрыемстваў «Да 75-годдзя вызвалення Віцебскай вобласці ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў» адбылася прэзентацыя кнігі Аркадзя Падліпскага «Витебск! У него своя, особая история освобождения».

ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Віцебска»

4 красавіка ў ЦГБ імя М. Горкага адбылося адкрыццё фотавыставы ўдзельнікаў спартыўна-турыстычнага клуба «Пилигрим» і творчы вечар кіраўніка клуба Васіля Калтунова.

Да Міжнароднага дня вызвалення вязняў фашысцкіх канцлагераў ў бібліятэцы імя Я. Купалы прайшла сустрэча з вязнем канцлагера «5 полк» Маяй Міхайлаўнай Александровіч; у бібліятэку імя У. Маякоўскага на прэзентацыю кнігі А. Аксёнава «Цена ошибок» былі запрошаны навучэнцы Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага каледжа.

18 красавіка ў ЦГБ імя М. Горкага адбылася духоўна-асветніцкая сустрэча «Святы і радасць абвяшчаюць званы…», прысвечаная выхаду кнігі «Колокольный звон – душа народа» Алены Шацько. **19 красавіка** была праведзена вечарына-прысвячэнне «На любовь свое сердце настрою…» да 95-годдзя з дня нараджэння вядомага паэта і барда Булата Акуджавы.

Літаратурнае свята «Гимн слову, книге и библиотеке», прысвечанае 70-годдзю бібліятэкі імя Уладзіміра Маякоўскага, адбылося **25 красавіка**. З юбілеем бібліятэку прыйшлі павіншаваць яе самыя шчырыя сябры – навучэнцы школ і каледжаў мікрараёна, вядомыя віцебскія паэты і пастаянныя чытачы.

Работнікі бібліятэкі імя У. Караткевіча падрыхтавалі для вучняў СШ № 11 вусны часопіс «Як трывожна гартаць дзён тваіх палыновых чаргу», прымеркаваны да 33-годдзя Чарнобыльскай трагедыі.

бібліятэка – цэнтр экалагічнай асветы – віктарынны кактэйль «День защиты детей – время книг и затей».

ДУК «Лепельская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

9 мая работнікамі дзіцячай бібліятэкі была арганізавана гульня-квэст «Па дарогах франтавых» у гарадскім парку.

У ЦРБ **13 мая** была праведзена гутарка-рэквіем «Помнить… и никогда не забывать», **30 мая** адбылася гадзіна памяці «Улицы наших героев».

Работнікамі ЦРБ **у чэрвені** былі арганізаваны: выязная чытальная зала «Кнігі пад сонцам», заняткі ў творчай лабараторыі, прафесійны візіт у Поўсвіжскую сельскую бібліятэку (краязнаўчы ваяж «І родны край адкрые таямніцы»).

Дзіцячая бібліятэка праводзіла мерапрыемствы ў рамках праграмы летніх чытанняў «Литературные мУРА!шки» са школьнымі лагерамі. Сельскія бібліятэкі працавалі па праграме летніх чытанняў «Мы хотим, чтоб наше лето было книгами согрето!».

ДУК «Лёзненская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

Да Дня яднання народаў Беларусі і Расіі ў літаратурнай кавярні ЦРБ **2 красавіка** адбыўся міжнародны дыліжанс паэтаў літаратурнага аб'яднання «Современник» (г. Рудня) і народнага аматарскага літаратурнага аб'яднання «Пад абажурам» (г. п. Лёзна). Гучалі вершы і песні на рускай і беларускай мовах, была падрыхтавана фотавыстава «Рядом с Россией-Русью – светлая Белая Русь».

3 красавіка ў Смаленскай АУНБ імя А. Т. Твардоўскага адбыўся адборачны этап міжнароднага паэтычнага конкурсу «БиблиоПарнас-2019», у якім удзельнічалі 5 канкурсантаў з г. п. Лёзна. **20 красавіка** адбыўся фінал конкурсу, у якім паспяхова выступіла загадчык аддзела па рабоце з дзецьмі ЦРБ Вольга Пячонава.

У **маі** ва ўсіх бібліятэках сістэмы праходзіла патрыятычная акцыя «Ніхто не забыты, нішто не забыта». Тыдзень ваеннай кнігі «Рэха вайны і памяць сэрца» арганізавалі супрацоўнікі ЦРБ. Бібліятэкары Падсвільскай дзіцячай бібліятэкі аб'явілі акцыю «Напішы пісьмо салдату», у выніку якой дзеці на працягу месяца пісалі лісты савецкаму воіну ў далёкія 1941-ы або 1945-ы гады.

ДУК «Докшыцкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

18 мая Бягомльская гарпасялковая бібліятэка імя П. Панчанкі ўдзельнічала ў правядзенні мерапрыемства «Ноч у музеі». На бібліятэчнай пляцоўцы «Дарогамі вайны» была афармлена кніжная выстава «Пусть будет мир!» і праходзіла акцыя «Мы о войне стихами говорим».

17–21 чэрвеня ў рамках Тыдня ўстойлівай энергіі ў бібліятэках сістэмы прайшоў шэраг мерапрыемстваў: гадзіны энергазбераження, тэматычныя гутаркі, інтэрактыўныя і пазнавальныя гульні, інфармацыйныя гадзіны і інш.

ДУК «Дубровенская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

11 красавіка ў ЦРБ быў арганізаваны тэматычны вечар «На детстве моем войны отметина», на які былі запрошаны вязні фашысцкіх канцлагераў.

25 красавіка ў дзіцячай бібліятэцы адбылося тэатралізаванае прадстаўленне «С книгой мир добрей и лучше».

26 красавіка ў Асінторфскую сельскую бібліятэку-цэнтр экалагічнай асветы была запрошана паэтэса і пісьменніца Тамара Гайко на літаратурны партрэт «Урокі жыцця ў паэтычным радку».

У ЦРБ **9 мая** была праведзена акцыя «Франтавая бібліятэка», **15 мая** – літаратурна-музычная кампазіцыя «Они могли бы жить» па матывах аповесці Б. Васільева «А зори здесь тихие».

У **чэрвені** для малодшых школьнікаў дзіцячая бібліятэка арганізавала бібліяпаляну «С книгой лето веселей», Асінторфская сельская

«Мастерство рук и красота души» – пад такой назвай у ЦГБ імя М. Горкага на працягу **мая** экспанавалася выстава творчых работ Віцебскай гарадской арганізацыі ГА «Беларускае таварыства інвалідаў».

9 мая ЦГБ імя М. Горкага прыняла ўдзел у святочных мерапрыемствах, прысвечаных Дню Перамогі. На вуліцы А. Пушкіна адбылася прэзентацыя інфармацыйнага праекта бібліятэкі – інтэрактыўнай карты «Беларусь помнит. Дороги войны – дороги Победы», кніжнай мастацка-дакументальнай выставы «Старонкі мужнасці і славы».

13 мая ў бібліятэцы імя Я. Купалы для сябраў клуба маладых інвалідаў «Надежда» правялі гутарку «Семейный очаг».

У бібліятэках горада стартавалі інфармацыйныя праекты, прысвечаныя эстафеце «Пламя мира» і II Еўрапейскім гульням у Мінску: кніжна-ілюстрацыйныя выставы і выставы-панарамы, слайд-парады, пазнавальныя праграмы, спартландыі, спаборніцтвы эрудытаў, літаратурна-спартыўныя эстафеты і віктарыны, фотазоны.

6 чэрвеня бібліятэка імя Еўфрасінні Полацкай адзначыла 25-гадовы юбілей. У сценах «храма ведаў» сабраліся самыя адданыя чытачы, прадстаўнікі адміністрацыі горада і калегі, каб павіншаваць культурна-асветніцкі і духоўны цэнтр мікрараёна Поўдзень-7 са святам.

26 чэрвеня ў ЦГБ імя М. Горкага адбылася прэзентацыя электроннай базы даных «Ганаровыя грамадзяне горада Віцебска». Гэты інфармацыйны рэсурс уключае біяграфічныя і бібліяграфічныя матэрыялы, архіўныя і фотадакументы пра 55 чалавек. Званне «Ганаровы грамадзянін горада Віцебска» было заснавана 26 чэрвеня 1964 года. Яно прысвойваецца за значны ўклад у сацыяльна-эканамічнае, навукова-тэхнічнае і культурнае развіццё горада, высокія дасягненні ў прафесійнай, грамадскай і дабрачыннай дзейнасці і іншыя заслугі перад Віцебскам. Прысвечаная гэтым выдатным людзям электронная база даных мае пазнавальнае і выхаваўчае значэнне.

26 чэрвеня ў цэнтральнай бібліятэцы адкрылася выстава работ фатографа, сябра «Рускага геаграфічнага таварыства» Васіля Мясаедава

«Віцебск сёння». Аўтар – сын легендарнага ўдзельніка вызвалення Віцебска Дзмітрыя Мясаедава.

ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Наваполацка»

16 красавіка ў ЦБ імя У. Маякоўскага прайшоў канцэрт літаратурна-музычнага аб'яднання «Крылы», прысвечаны 17-годдзю з дня яго стварэння. Гледачам была прадстаўлена прэзентацыя «Яны былі побач з намі», прысвечаная памяці былых удзельнікаў калектыву. Канцэртную праграму склалі аўтарскія вершы і песні ўдзельнікаў калектыву, а таксама творы вядомых аўтараў.

23 красавіка дзіцячая бібліятэка імя А. С. Пушкіна правяла тэлемост «Дружба народаў» з Курганскай абласной дзіцяча-юнацкай бібліятэкай імя В. Ф. Патаніна. На анлайн-сустрэчы Рэспубліку Беларусь прадстаўлялі навучэнцы 3 «А» класа СШ № 3 і супрацоўнікі ЦБС г. Наваполацка.

ЦБ імя У. Маякоўскага працягвала знаёміць гараджан з творчасцю наваполацкіх літаратараў. **17 красавіка** тут прайшоў творчы вечар паэта, члена РГА «Беларускі літаратурны саюз «Полоцкая ветвь», аўтара чатырох паэтычных зборнікаў Пятра Магера. **27 красавіка** адбылася сустрэча з пісьменнікам-земляком Паўлам Гушынцом, прысвечаная Дню Перамогі і 75-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Аўтар прэзентаваў сваю новую кнігу «Вайна дзяўчынкі Сашы».

У **маі** бібліятэкі ЦБС прысвяцілі свае мерапрыемствы Дню Перамогі, Году малой радзімы, Міжнароднаму дню сям’і іншым падзеям і датам.

У дзіцячай бібліятэцы імя А. С. Пушкіна прайшла літаратурна-музычная кампазіцыя «Мы помним, помнить миру завещаем» і гадзіна цікавых паведамленняў «Животные тоже воевали».

У бібліятэцы імя У. Караткевіча Дню Перамогі быў прысвечаны тэматычны тыдзень «Не гаснет памяти свеча, поклон вам, дорогие ветераны!».

18 красавіка юныя наведвальнікі Вархоўскай с/б адправіліся ў займальнае віртуальнае падарожжа «Гістарычная вандроўка па родным краі», прымеркаванае да Міжнароднага дня помнікаў і гістарычных мясцін.

24 красавіка бібліятэкары Бычыхінскай с/б сумесна з работнікамі СДК у памяць пра трагічныя падзеі на ЧАЭС правялі ўрок-сустрэчу «Пока Чернобыль глядит нам в душу».

24 мая ў ДУК «Гарадоцкі культурна-асветніцкі центр і сетка публічных бібліятэк» прайшоў семінар бібліятэчных работнікаў пад назвай «Роля бібліятэкі ў патрыятычным выхаванні дзяцей і падлеткаў», прымеркаваны да святкавання 75-й гадавіны вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У рамках семінара адбылося пашыранае пасяджэнне Савета пры дырэктары на тэму «Работа бібліятэк Езярышчанскага сельсавета па грамадзянска-патрыятычным выхаванні дзяцей і моладзі». Затым семінар прадоўжыўся ў Езярышчанскай гарпасялковай бібліятэцы, дзе работнікі пазнаёмілі прысутных з дзейнасцю сваёй бібліятэкі, з музейным пакоем «Востраў таленту і этнаграфіі» і запрасілі ў падарожжа да помнікаў і абеліскаў «Памятаем і шануем».

ДУК «Глыбоцкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

У красавіку праведзены мерапрыемствы да Года малой радзімы: краязнаўчыя гадзіны «Малая родина – большая любовь» (Ломашаўская с/б), «Здесь я родился, здесь я живу» (Шунеўская с/б); слайд-экскурсія «Да болю родныя мясціны» (Чарневіцкая с/б); краязнаўча-турыстычны экскурс «7 цудаў Віцебскай вобласці» (Псуеўская с/б) і інш. Тэматычны семінар «Роля бібліятэкі ў захаванні гістарычнай памяці» быў арганізаваны аддзелам бібліятэчнага маркетынгу ЦРБ. У рамках семінара была прэзентавана кніга «Афганистан – героизм. Афганистан – боль. Афганистан – память» (пра воінаў-інтэрнацыяналістаў Глыбоччыны); былі прадэманстраваны два паказальныя мерапрыемствы – інфармацыйна-патрыятычная гадзіна «Помнікі дзецям вайны» і ваенны відэа-рэпартаж «Память в наследие».

«Росчерком пера» з аўтографамі аўтараў, майстар-класы «Мастерская радости» ад Дома рамёстваў і інш.

ДУК «Віцебская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

5 красавіка ЦРБ прымала ўдзел у раённым мерапрыемстве «Чалавек года Прыдзвіння». Супрацоўнікі бібліятэкі ладзілі ўласную пляцоўку выставачнага павільена «Зал славы», дзе прадстаўлялі «Чалавека года Віцебскага раёна» Г. Д. Нісневіч – дырэктара Віцебскай РЦБС, якая ў 2019 годзе занесена на раённую Дошку Гонару.

12 красавіка ў Капцянскай с/б у рамках праекта «Жывы аўтограф» адбыўся паэтычны вечар інваліда дзяцінства Ірыны Малашэнкі «Я зноў пішу ў парыве натхнення…».

17 красавіка ЦРБ сумесна з ПЦПІ правяла на базе Тулаўскай с/б прававую сустрэчу на тэму «Малы бізнес – вялікая адказнасць».

18 красавіка ў Кіраўскай бібліятэцы адкрылася выстава работ віцебскага жывапісца, паэта і пісьменніка Алега Кірушкіна і адбылася прэзентацыя яго кнігі «Лёс і адказнасць».

18 мая ў Акцябрскай бібліятэцы праведзена сустрэча з паэтэсай Людмілай Сасноўскай і прзентацыя яе зборніка вершаў «Адажыа».

19 мая Сасноўскую с/б наведаў віцебскі гісторык і краязнаўца Мікалай Півавар з групай студэнтаў. Мэта – вывучэнне і папулярызацыя назапашаных у бібліятэцы краязнаўчых матэрыялаў.

ДУК «Гарадоцкі культурна-асветніцкі цэнтр і сетка публічных бібліятэк»

11 красавіка ў ЦРБ у рамках Кафедры праваслаўнай літаратуры адбылася сустрэча «Вечных истин немеркнущий свет» з іерэем Уладзімірам Дагодзькам, Благачынным Гарадоцкага раёна. На сустрэчы прысутнічалі работнікі ЦРБ і ўдзельнікі бібліятэчнага клуба «Залаты ўзрост».

У ЦБ імя У. Маякоўскага адбылася сустрэча пакаленняў «Огонь войны души не сжёг…»; працягваўся цыкл мерапрыемстваў «Малая радзіма – ды большай, здаецца, няма…».

Міжнароднаму дню сям'і было прысвечана чарговае пасяджэнне клуба «Оранжевое настроение» ў бібліятэцы імя К. Сіманава. Маладыя людзі з асаблівасцямі развіцця прынялі ўдзел у мерапрыемстве «Загляни в свой семейный альбом».

У **чэрвені** ўсе бібліятэкі ЦБС праводзілі мерапрыемствы да Дня горада. У ЦБ імя У. Маякоўскага прайшоў Х песенна-лірычны канцэрт-марафон народнага калектыву «Крылы»; дзіцячая бібліятэка імя А. Пушкіна запрасіла чытачоў на літаратурна-музычную кампазіцыю «И в песнях, и в стихах поэтов пусть расцветает город мой», а бібліятэка імя У. Караткевіча – на краязнаўчую прагулку «Люблю цябе, мой горад!». У дзіцячай бібліятэцы імя С. Маршака юныя чытачы здзейснілі вандроўку «Усяму пачатак тут, у краі маім родным». Супрацоўнікі бібліятэкі імя Я. Коласа падрыхтавалі літаратурны пікнік «Нескучная улица».

25 чэрвеня ў ЦБ імя У. Маякоўскага адбыўся канцэрт «Беларусь – легендарная, мужная…» народнага калектыву «Крылы».

ДУК «Бешанковіцкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

Мемарыяльную дошку і музейны пакой памяці грамадскага дзеяча, паэта і празаіка Барыса Паўлавіча Беляжэнкі адкрылі ў Бачэйкаўскай сельскай бібліятэцы Бешанковіцкага раёна. Аўтар мемарыяльнай дошкі Аляксандр Гвоздзікаў. (*Витебские вести. – 2019. – 1 чэрв. – С. 15.*)

ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма Браслаўскага раёна»

23 красавіка ў ЦБ быў арганізаваны семінар бібліятэчных работнікаў сістэмы «Інавацыі ў бібліятэцы: ад ідэі да ўвасаблення».

23–28 красавіка ў Відзаўскай гп/б праходзіў Тыдзень інфармацыйнай падтрымкі прафарыентацыі.

30 красавіка бібліятэкары разгарнулі маштабную кніжна-ілюстрацыйную выставу «Беларусь і Браслаўшчына: багатая гісторыя, годная сучаснасць» у раённым Цэнтры культуры.

На працягу **красавіка** ў Слабодкаўскай с/б экспанавалася выстава работ самадзейнага браслаўскага мастака Яна Рыдзікі.

У **маі** работнікі ЦБ арганізавалі для падлеткаў летнюю чытальную залу пад адкрытым небам «Браслаўшчына – вывучаем, пазнаём, ганарымся» і бібліятэчна-інфармацыйную пляцоўку «Алея славы герояў Браслаўшчыны».

20 чэрвеня ЦБ правяла выязны семінар у Шаркаўшчынскім раёне ў рамках творча-інавацыйнага праекта «Пашыраем прафесійныя гарызонты». Яго ўдзельнікі наведалі мастацка-этнаграфічны музей імя Я. Драздовіча і недзяржаўны літаратурна-мастацкі музей імя М. Райчонка ў агр. Германавічы, бібліятэку агр. Лужкі. У Шаркаўшчынскай ЦРБ бібліятэкары перадалі калегам эстафету «75 добрых спраў», якая праходзіць у бібліятэках Браслаўшчыны да 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашыскіх захопнікаў. Адбыўся абмен вопытам работы і друкаванай прадукцыяй.

21 чэрвеня Відзаўская гарпасялковая бібліятэка правяла для старшакласнікаў мерапрыемства да Дня памяці і смутку – ваенна-храналагічны рэпартаж «Відзы ў гады Вялікай Айчыннай вайны».

23 чэрвеня работнікі ЦБ арганізавалі літаратурна-музычную пляцоўку «Чароўны край Ігара Пракаповіча» з удзелам вядомага паэта, перакладчыка, краязнаўцы.

ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма Верхнядзвінскага раёна»

Развіццю ўстойлівага і ўсвядомленага інтарэсу да чытання, пашырэнню чытацкага і культурнага кругагляду, падтрымцы чытання як важнейшага элемента культуры быў прысвечаны семінар «Привлечь!

Удивить! Удержать!», арганізаваны аддзелам бібліятэчнага маркетынгу **3 красавіка**.

25 красавіка для навучэнцаў СШ № 2 г. Верхнядзвінска было праведзена мерапрыемства «Чернобыль – трагедия, подвиг».

30 красавіка ў чытальнай зале раённай бібліятэкі адбылася сустрэча з пісьменнікам і паэтам, членам Саюза пісьменнікаў Беларусі Міледзіем Кукуцем.

29 мая прайшло пашыранае пасяджэнне прэзідыума Верхнядзвінскага раённага Савета дэпутатаў, на якім прысутнічалі прадстаўнікі ўлады, старшыні сельвыканкамаў, ідэалагічны актыў раёна, настаўнікі, бібліятэчныя работнікі. Тэма пасяджэння – «О библиотеке как центре информационных, культурных и социальных коммуникаций». Увазе прысутных быў прадстаўлены даклад дырэктара ДУК «Верхнядзвінская ЦБС» Л. А. Куўшынавай і мультымедыйная прэзентацыя аб рабоце бібліятэк раёна. Загадчык аддзела абслугоўвання і інфармацыі ЦРБ Н. С. Глацёнак расказала аб краязнаўчым напрамку работы. Настаўнік СШ № 2 г. Верхнядзвінска Н. М. Жугіна – аб першых выніках рэалізацыі праекта дзіцячай бібліятэкі «Вместе с книгой мы растём», мэта якога – развіць устойлівы інтарэс да чытання ў вучняў 1«Б» класа. Удзельнікі пасяджэння наведалі раённую бібліятэку, дзе пазнаёміліся з краязнаўчай мультымедыйнай прэзентацыяй «Утраченное наследие», а таксама выставамі і кнігамі самвыдату.

21 чэрвеня ў народным клубе «Сучаснік» адбылася вечарына-сустрэча з верхнядзвінскім паэтам-песеннікам Мікалаем Карагодам.

Супрацоўнікі дзіцячай бібліятэкі падрыхтавалі тэатралізаванае прадстаўленне «Заморочки из «Пушкинской бочки» для наведвальнікаў летніх дзіцячых лагераў.

28 чэрвеня ЦРБ і дзіцячая бібліятэка запрасілі на штогадовую акцыю «Бібліяноч-2019» да Дня моладзі. У праграме: сустрэча з паэтам і бардам Алесем Камоцкім, гульня-віктарына «Літаратурная карта Верхнядзвіншчыны», квэст «Джуманджи по-верхнедвински», выстава кніг